ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 42 (4294)
Субота, 20 лютага 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 63

Сёньня ў нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Завяршыць фінансавую праграму чацьвертага, заключнага. АЛЕКСАНДРОВІЧ — Вапнаваньне глебы — адна з галоўных умоў узьняцьця ўраджайнасьці (3 стар.).

Усю ўвагу—правільнай падачы апалу на БелДРЭС. Вопыт барацьбы МТС за збожжа перанесьці на ільназагатоўкі. Стварэньне калгасных насенных фондаў — цэнтральная задача дня (1 стар.).

Узмацненьне працысцыпліны — зарука пасьпяховай работы чыгуначнага транспарту. Няўхільна ажыцьцяўляць ленінскую нацпалітыку. Аб рабоце навукова-дасьледчага інстытуту сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі імя Леніна (пастанова ЦКК-РСІ БССР) (2 стар.).

Барацьба за якасьць — асноўнае зьвяно с.-г. машынабудаўніцтва. Вывозіць на менш 1 млн куб. мэтраў лесу ў дзкаду. Марксыцка-ленінскае выхаваньне новага папаўненьня на вышэйшую ступень (ліст ГК і РК КП(б)Б). Барысаўскі і Церахаўскі раёны абавязаны неадкладна ліквідаваць адставаньне ў жывёлазагатоўках (3 стар.).

Шырока разгарнуць генэральную праверку работы па ліквідацыі няпісьменнасьці. Перагаворы памiж Японіяй і Кітаем перарваны. Расгортваецца падрыхтоўка да новых вялікіх баёў. Апошнія навіны (4 стар.).

Завяршыць фінансавую праграму 4-га заключнага

Савецкі Саюз уступіў у 4 заключны год пяцігодкі са значна-ўзмоцненай грашовай сыстэмай. У той час, калі ўвесь капіталістычны сьвет перажывае надзвычай востры фінансава-эканамічны крэзіс — фінансавая моц Савецкага Саюзу, у выніку пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва, вялізарных посьпехаў у разьвіцьці аграмаджанай гаспадаркі і ўздыму дабрабыту шырокіх мас, значна ўзрасла. Досыць адзначыць, што валавая прадукцыя прамысловасьці СССР у 1931 годзе павялічылася на 21 проц., што народны даход вырас за год на 13,2 проц. — такіх тэмпаў не ведала і ня можа мець ні адна капіталістычная краіна нават у лепшыя гады свайго росквіту.

Перавага сацыялістычнай плянавай арганізаванай гаспадаркі дала магчымасьць перавыканаць плян фінансаваньня сацыялістычнага будаўніцтва і стварыць бездэфіцытны бюджэт.

Па БССР план фінансаваньня народнай гаспадаркі ў 1931 г. выканан на 100,3 проц., у тым ліку па прамысловасьці — на 100,1 проц.

Практыка мінулага году асабліва выразна паказала шчыльную залежнасьць узмацненьня савецкай фінансавай сыстэмы і выкананьня бюджэту ад выкананьня ўсяго народна-гаспадарчага пляну, работы сацыялістычнай прамысловасьці і росту накапленьняў у краіне.

1931 год прайшоў пад знакам барацьбы за ўкараненьне гаспадарчага разрахунку, за разгортваньне тэмпаў накапленьняў, за мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў у мэтах забесьпячэньня ажыцьцяўленьня вялізарнай праграмы будаўніцтва гігантаў індустрыі, апорных пунктаў сацыялістычнага земляробства, жыльлёвага будаўніцтва і г. д.

Праведзеная крэдытная рэформа, суровы кантроль рублём значна павысілі манэўраздольнасьць гаспадарчых арганізацый, павялічылі тэмпы накапленьняў; дазволілі нам падыйсьці да барацьбы за вялікую праграму 4 заключнага значна лепш узброенымі, чым у мінулым годзе.

Аднак, механізм гаспадарчага разрахунку ня пушчан поўнасьцю ў ход па ўсёй лініі дзяржаўнай гаспадаркі, ва многіх зьвеньнях яшчэ жыве інэрцыя, нагляджаецца ікненьне да аўтаматычнага крэдыту, недапушчальнае ігнараваньне фінансавай дысцыпліны і спраўы накапленьняў.

Дагэтуль ёсьць шмат выпадкаў парушэньня закону аб крэдытаваньні (Лесбел, Прамкаапэрацыя), атрыманьня пазыкі пад прадаты тавар (Белгандаль). Пратэрмінаваныя банкаўскія крэдыты складаюць звыш мільёну рублёў.

Прамысловасьці БССР у сувязі з невыстарчальным ажыцьцяўленьнем гаспадарчага разрахунку і 6 умоў тав. Сталіна паогул, не давыканала вытворчай праграмы па радзе важнейшых паказальнікаў, што адбілася на выкананьні адзінага фінансавага пляну.

Буйнейшая задача 1932 году, адна з рашаючых прадпасылак пасьпяховага выкананьня пяцігодкі за чатыры гады — гэта поўнае ўкараненьне гаспадарчага разрахунку і забесьпячэньне высокіх тэмпаў накапленьняў у дзяржаўнай гаспадарцы.

XVII усесаюзная партканфэрэнцыя ў сваіх пастановах падкрэсьліла першараднае значэньне правядзеньня прынцыпу гаспадарчага разрахунку ў справе ўзмацненьня матар'яльнай базы сацыялістычнага будаўніцтва. Канфэрэнцыя адзначыла поўную несумяшчальнасьць з палітыкай партыі і інтарэсамі рабочай клясы буржуазна-нэпманскіх скажэньняў прынцыпу гаспадарчага разрахунку.

Разгортваньне савецкага гандлю стаяла ў 1931 годзе ў цэнтры ўвагі партыі і ўсёй краіны. Партыя нанесла бязьлітасны ўдар па спробах замарозіць таваразварот, па імкненьнях да непасрэднага прадуктаабмену падкрэсьліўшы гэтым выключнае значэньне паляпшэньня савецкага гандлю для ўсёй народнай гаспадаркі.

За 1931 год удалося дабіцца значных посьпехаў у пашырэньні таваразвароту. Гэтыя посьпехі зьявіліся магутным вагаром узмацненьня фінансавай сыстэмы і бесьперабойнага фінансаваньня важнейшых вучасткаў сацыялістычнай будоўлі.

Аднак, арганічная сувязь паміж разгортваньнем таваразвароту і нашай фінансавай палітыкай ўсьвядомлена далёка ня ўсімі фінансава-крэдытнымі і каапэрацыйнымі работнікамі. Плян таваразвароту спажывецкай каапэрацыі БССР выкананы у 1931 годзе толькі на 85.2 проц. студзеньскі плян на 89,7 проц. Недабор грошай па студзеньскім пляне перавышае 4 млн. рублёў.

У 1932 годзе пытаньне разгортваньня савецкага гандлю і таваразвароту патрабуе самай выключнай увагі ўсёй пралетарскай грамадзкасьці. Яно прадрашае пытаньне накапленьня сродкаў і набывае вялізарнае значэньне для нашай безэмісійнай гаспадаркі.

XVII партканфэрэнцыя ў дырэктывах да складаньня 2-й пяцігодкі высунула задачу разгортваньня савецкага гандлю, як баявое першачарговае заданьне.

З кожным годам усё большую і большую ўдзельную вагу ў фінпляне набывае **мабілізацыя сродкаў насельніцтва**. У фінпляне БССР на 1932 год мабілізацыя сродкаў насельніцтва займае 35 проц. Той факт, што папа будаўніцтва разгортваецца за кошт бягучых накапленьняў, абавязвае фінансава-крэдытную сыстэму энэргічна змагацца за прыцягненьне сродкаў насельніцтва ў рэчышча фінансаваньня сацыялістычнага будаўніцтва.

Вялізарны рост даходаў насельніцтва СССР (43,6 млрд. у 1931 г. супроць 31,4 млрд. у 1930 г.), бурны рост сацыялістычнай індустрыі адкрываюць у гэтай галіне самыя шырокія пэрспэктывы і вялізарныя магчымасьці.

У БССР у 1931 годзе мабілізацыя сродкаў насельніцтва дала 106,9 проц. пляну. Заданьне па добраахвотных плацяжох перавыканана на 11,5 проц. Гэта перамога дасягнута, дзякуючы правільнаму партыйнаму кіраўніцтву фінансавай работай і карэннай рэарганізацыі апошняй на аснове адмаўленьня ад мэтадаў апартуністычнага самацёку і кампанейшчыны і пераходу на масава-грамадзкія формы.

Перабудова фінансавай работы зьявілася зарукай сыстэматычнага роўнамернага ажыцьцяўленьня даходнай часткі бюджэту.

Вопыт перадавых гарадоў БССР (Гомель, Віцебск, Менск), асабліва ў чацьвертым квартале, мінулага году, выразна паказаў, што ключ для перамог на фінансавым фронце — ва ўжываньні сацыялістычных мэтадаў, выкананых па перадавых вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.

Першы квартэл г. г. у галіне мабілізацыі сродкаў прайшоў пад лёзунгам правядзеньня **ўсебеларускага фінансавага паходу** ў мэтах датэрміновага выкананьня пляну. На базе шырокай масавай работы рад раёнаў здолеў да 10 лютага мабілізаваць больш паловы квартальнага заданьня (Тураў — 67 проц., Мазыр — 65 проц., Старобін — 62,5 проц., Чачэрск — 56 проц., Гомель — 52,9 проц., Сіроціна — 51,8 проц.). Аднак, выключна дрэнная работа некаторых раёнаў (Лельчыцкага — 16 проц. квартальнага заданьня, Бягомльскага — 19,7; Расонскага — 20.8 проц. і інш.), якія ня здолелі ліквідаваць апартуністычны самацёк і ўцягнуць шырокія масы ў барацьбу за фінплян, самым адмоўным чынам адбіліся на мабілізацыі сродкаў па БССР наогул. Квартальны фінплян па 10 лютага выкананы на 39,3 проц.

1932 год зьяўляецца апошнім годам першай пяцігодкі, годам гіганцкага ўздыму тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. Выкананьне фінпляну г. г. прадрашае выкананьне народнагаспадарчага пляну. Гістарычныя задачы 1932 году патрабуюць вялізарнага ўзмацненьня ўвагі да фінансавага фронту.

Пад кіраўніцтвам партыі, напосячы руйнуючы ўдар па праваапартуністычнай недаацэнцы фінансавай работы, па «лявацкіх» разважаньнях аб «адміраньні грошай на даным этапе», мы выкананем фінансавую праграму чацьвертага заключнага.

Стварэньне калгасных насенных фондаў— цэнтральная задача дня

Рэалізаваць унутраныя рэсурсы калгасаў, поўнасьцю загатовіць насеньне траў

Рашуча ўдарыць па месьніцкіх тэндэнцыях

Для больш шпаркага вырашэньня праблемы жывёлагадоўлі БССР павінна ў гэтым годзе стварыць магутную ўласную кармовую базу. Для гэтай мэты па пляне намечана засеяць 380 тыс. гэкт. кармовых траў, 55.000 гэкт. кораньплодаў. Для таго, каб вызваліцца ад завозу насеньня з-за межаў СССР, Савецкая Беларусь павінна **рэалізаваць усе наяўныя ўнутраныя рэсурсы**, калгасы і саўгасы павінны забясьпечыць сябе сваім насеньнем.

Аднак, паводле даных Насэнканторы плян загатовак на 10-га лютага па кармовых травах выкананы на **15,44** проц., па кораньплодах — на **20,79** проц., па гародніне — на **6,81** проц., бабовых — на **27,97** проц.

Ня гледзячы на тое, што тэрміны скончэньня загатовак насеньня даўно прайшлі, першая дэкада лютага не дала належнага зруху. Прырост за дэкаду па травах усяго толькі на **1,85** проц., кораньплодах — на **2,63 проц.**, гародніне — **0,38** проц., бабовых — **0,57 проц.**

Прычынай невыкананьня пляну загатовак зьяўляюцца, перш за ўсё у спажывецкіх месьніцкіх тэндэнцыях, якія панююць сярод некаторых адказных раённых работнікаў, у тым, што частка калгасаў і саўгасаў не сьпяшаецца з абмалотам насенных траў і г. д.

Характэрна, што **Лепельскі** райвыканком вынес пастанову—загатаўляць насеньне пад захавальныя расьпіскі, залічваць іх (расьпіскі) у плянны выкананьня, а ліквідацыі ўдаць пасьля сэўбы. Работнікі райвыканкому не разумеюць дырэктыў партыі і ўраду, падзяляцку падыходзяць да вырашэньня задач загатоўкі насенных траў. Калі выконваць гэту прасякнутую месьніцкімі тэндэнцыямі пастанову РВК, дык раёны і калгасы, якія сапраўды ня маюць насеньня кармовых траў, ня зможуць выканаць плянаў весняй сэўбы.

Таму зусім няма нічога дзіўнага, што плян загатовак насеньня канюшыны па Лепельскім раёне выкананы на **5,72** проц., а па гародніне і кораньплодах не загатоўлена ніводнага кілё. Такую-ж «палітыку» праводзяць райкалгасасаюзы Старобінскага і Лоеўскага раёнаў, якія далі дырэктыву калгасам не здаваць насеньня па кантрактацыйных дагаворах, нагуль ня скончыцца сэўба. Адкін з калгасаў Старобінскага раёну прывёз 20 кілё насеньня гуркоў на загатоўчы пункт. Райкалгасасаюз адаслаў работніка гэтага калгасу назад і загадаў разьмеркаваць насеньне паміж калгасьнікамі.

Раённыя камітэты партыі павінны прыцягнуць да суровай адказнасьці апартуністаў, дзяляг, якія ня ўмеюць і не жадаюць злучаць інтарэсы свайго раёну з інтарэсамі ўсёй рэспублікі, якія зрываюць пляны загатовак. Даючы рашучы адпор кулацка-рвацкім тэндэнцыям, неабходна дабіцца выкананьня пляну загатовак насеньня траў, кораньплодаў і гародніны ў самыя бліжэйшыя дні.

Мабілізаваць актыў, грамадзкасьць на поўнае ажыцьцяўленьне пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б), якія ўказваюць **«усім партыйным і савецкім арганізацыям на тое, што цэнтральнай задачай іх работы ў вёсцы ў бліжэйшыя тыдні зьяўляецца стварэньне насенных калгасных фондаў у разьмерах, неабходным для поўнага выкананьня пасеўных плянаў».**

БССР выканала плян ссыпкі насенных фондаў па ўсіх відах культур толькі на 29,1 проц. Значна адстаюць ільнаводчыя (24 проц.) раёны, якія ў першую чаргу павінны забясьпечыць сябе ільнанасеньнем.

Трэба работу па зборы насенных фондаў перавесьці на ўдарныя рэйкі. Кінуць сёньня сілы на барацьбу за насеньне. Выканаць поўнасьцю пастанову ЦК КП(б)Б аб скачэньні гэтай работы да 10 сакавіка!

Зводка Белканторы Саюзнасеннаводаб'яднаньня аб ходзе загатовак насеньня кармовых траў, кораньплодаў, бабовых і гародных культур па сэктарох БССР на 10 лютага 1932 году

Назва сэктароў.	Загатоўлена ў проц. да пляну			
	Кармовых траў.	Кораньплодаў.	Гародніны.	Бабовых.
Дзяржсэктар	11,12	27,41	9,52	—
Калгаснасеннсаюз	19,59	15,64	5.56	13,91
Хлебазывсаюз	7,91	18,99	1,95	10,85
Ільнаканапляводсаюз	9,33	—	—	—
Садсаюз	9,23	376,66	70,95	—
РАЗАМ	15,44	20,79	6,81	27,97

Арганізаваць сацыялістычную ўзаемадапамогу

ЖЫТКАВІЧЫ.. Партыйныя, камсамольскія ячэйкі і сельсаветы яшчэ не мабілізавалі калгасныя і бядняцка-серадняцкія масы на баявую падрыхтоўку да весняной сэўбы. Калгасаў, якія поўнасьцю ссыпалі насенныя і страхавыя фонды, у раёне зусім мала.

Ёсьць такія калгасы як «Чырвоны партызан» і інш., якія да гэтага часу ня скончылі абмалоту збожжа, што зрывае засыпку насенных і страхавых фондаў і здачу ліпкаў насеньня дзяржаве.

Даючы руйнуючы адпор усякім разважаньням аб завозе насеньня з-за межаў раёну, трэба зараз-жа скончыць засыпку насенных і страхавых фондаў, скарыстаўшы поўнасьцю ўсе ўнутраныя рэсурсы калгасаў і калгасьнікаў. Трэба шырока разгарнуць справу сацыялістычнай узаемадапамогі насеньнем паміж калгасамі. Л.

Пастанова Савету Народных Камісараў Саюзу ССР і Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б)

АБ ЗБОРЫ КАЛГАСНЫХ НАСЕННЫХ ФОНДАЎ НА СССР І АБ МЕРАХ НАСЕННАЙ І ХАРЧОВАЙ ДАПАМОГІ РАЁНАМ, ЯКІЯ ПАЦЯРПЕЛІ АД ЗАСУХІ

1. У сувязі з набліжэньнем пасеўнай кампаніі, Савет Народных Камісараў СССР і Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) указваюць усім партыйным і савецкім арганізацыям на тое, што цэнтральнай задачай іх работы ў вёсцы ў бліжэйшыя тыдні зьяўляецца стварэньне насенных калгасных фондаў у разьмерах, неабходных для поўнага выкананьня пасеўнага пляну.

Савет Народных Камісараў і Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) абавязваюць усе партыйныя, савецкія і калгасныя арганізацыі неадкладна ўзяцца за справу стварэньня калгасных насенных фондаў.

2. Зацьвердзіць устаноўлены Наркамземам СССР плян стварэньня насенных калгасных фондаў яравых збожжавых культур:

	У 1000 цэнт
УССР	9.500
Паўночны Каўказ	3.920
Нізкая Волга	3.820
Крымская АССР	203
ЗОФСР	440
Усб. ССР	500
Кіргізкая АССР	460
Туркменская ССР	30
Таджыкская ССР	180
Дагестанская АССР	36
Казакская АССР	3.000
Заходняя вобласьць	1.486
Іванаўская вобласьць	797
	У 1000 цэнт
Татарская АССР	1.291
Сярэдняя Волга	4.360
ЦЧО	3.489
ДВК	689
Паўночны край	948
Башкірыя	2.500
Заходняя Сібір	5.800
Нізкагародзкі край	2.480
Маскоўская вобласьць	1.786
Ленінградзкая	812
БССР	1.200
Урал	5.451
Усходняя Сібір	1.772
	57.355

Устанавіць у якасьці крайніх тэрмінаў скончэньня засыпкі насеньня для Украіны, Нізкай Волгі, Паўночнага Каўказу, Крыму і Сярэдняй Азіі 10 сакавіка, а для іншых рэспублік, раёнаў і абласьцей — 1 красавіка.

3. З прычыны таго, што на ўсходніх раёнах СССР у мінулым годзе была засуха і ў выніку гэтага рад калгасаў і саўгасаў гэтых раёнаў ня могуць са сваіх уласных рэсурсаў забясьпечыць поўнасьцю восганы насеў патрэбнай колькасьцю насеньня і ў радзе выпадкаў ёсьць некаторыя затрудненьні з харчамі, прадаставіць калгасам і саўгасам гэтых раёнаў бясплатную насенную і харчовую ссуду са зваротам увосень 1932 году натурай, у разьмеры 53 млн. 500 тыс. пуд., у тым ліку 39 млн. пудоў калгасам і 14 млн. 500 тыс. пудоў збожжавым, насенным і жывёлагадоўчым саўгасам.

4. Разьмеркаваць насенную і харчовую ссуду, якая адпускаецца калгасам, па культурах наступным чынам:

Пшаніцы	18,1 млн. пуд.
Аўса	8,2 » »
Ячменю	0,4 » »
Жыта	6,5 » »
(у т. л. 6 млн. пуд. на харчы)	
Кукурузы	3,0 » »
Сланэчніку	2,8 » »

5. Разьмеркаваць пшаніцу, авёс, ячмень і жыта, якія адпускаюцца калгасам у парадку насеньня і харчовай ссуды, па раёнах наступным чынам:

	Пшан.	Авёс	Ячм.	Жыта
Ніж. Волга	1,5	0,5	—	0,3
Сяр. Волга	3,9	1,9	—	1,5
Урал	4,2	2,3	0,4	1,7
Казакстан	3,45	0,5	—	1,5
Башкірыя	0.85	0,75	—	—
Зах. Сібір	3,9	1,4	—	1,5
Татарыя	0.3	0,9	—	—

6. Даручыць Наркамзему СССР разьмеркаваць адпушчаную ў насенную ссуду калгасам кукурузу і сланэчнік, а таксама адпушчанае саўгасам насеньне па раёнах.

7. Абавязаць Народны Камісарыят Земляробства водпуск дазакупнай насеннай ссуды рабіць толькі па меры стварэньня калгасамі насенных фондаў з уласных рэсурсаў.

8. Абавязаць Дзяржбанк прафінансаваць водпуск насеннай і харчовай дапамогі.

9. Савет Народных Камісараў і ЦК УсеКП(б) зьвяртаюць увагу ўсіх партыйных, савецкіх і калгасных арганізацый на тое, што збор насеньня павінен быць закончан усюды ў магчыма больш кароткі тэрмін з тым, каб своечасовай падрыхтоўкай да пасеўнай кампаніі забясьпечыць раньняе скончэньне сэўбы і тым самым дабіцца больш высокага ўраджаю.

10. Наркамзему СССР устанавіць штарацыйны нагляд за ходам збору насеньня і кожную дэкаду публікаваць зводку аб ходзе стварэньня насенных калгасных фондаў па раёнах, абласьцях і рэспубліках.

Старшыня Савету Народных Камісараў СССР —
В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).
Сакратар ЦК УсеКП(б) —
І. СТАЛІН.

ВОПЫТ БАРАЦЬБЫ МТС ЗА ЗБОЖЖА ПЕРАНЕСЬЦІ НА ІЛЬНАЗАГАТОЎКІ

РАШУЧА УЗМАЦНІЦЬ БАРАЦЬБУ З КУЛАЦКАЙ ДЗЯЛЬБОЙ І РАЗБАЗАРВАНЬНЕМ ВАЛАКНА

МТС—у авангард ільназагатовак!

На 15 лютага плян выкананя усяго на 54,7 проц. На калгасах МТС—56,4 проц., па іншых калгасах — 77,9 проц.

Пры агульным, зусім слабым ходзе кампаніі асабліва недапушчальным трэба лічыць гавебнае адставаньне калгасаў, якія абслугоўваюцца МТС. На Асьвейскай МТС плян на 15 лютага выкананя на 34 проц., Менскай—20,2 проц., Койданаўскай — 20,2 проц., Сіроцінскай — 35,9 проц., Горацкай — 44,7 проц. і г. д.

Многія МТС паказалі ўзоры сапраўднай баявой работы і барацьбы за збожжа, за арганізацыю збожжазагатоўчай кампаніі. Аднак, вопыт лепшых МТС у збожжазагатоўчай кампаніі не перанесен па ільназагатоўкі.

У чым асноўныя прычыны такога адставаньня МТС у загатоўках тэхкультур? У дзённым кіраўніцтве перапрацоўкай і здачай калгасамі таварнай прадукцыі дзяржаве, у разрыве паміж мяцьцём і трапаньнем і паміж трапаньнем і здачай.

Некаторыя МТС слаба змагаюцца за правільную арганізацыю перапрацоўкі, за стварэньне пастаянных брыгад. Не вядзецца рашучай барацьбы з кулацка-рвацкімі тэндэнцыямі, з разбазарваньнем і асяданьнем ільну па асобных калгасах (Расоны, Вушачы, Боркавічы).

Калгасцэнтр БССР і Наркамснаб далі зусім выразныя дырэктывы аб выдачы за трапаньне і мяцьцё грашовых авансаў і грашовых прэмій. Гэтыя дырэктывы не папулярызаваны сярод шырокіх мас калгасьнікаў.

Весткі з месц сьцвярджаюць таксама аб тым, што спажывецкая каапэрацыя ў радзе рабнаў ігнаруе паказаньні аб стымуляваньні ільназагатовак прамтаварамі. Ёсьць факты завозу ў ільнаводчыя раёны зусім няходкіх тавараў. У той-жа час у паасобных калгасах («Гарбачова», Расонскага раёну) атрыманыя прамтавары разданы тым калгасьнікам, якія ня былі заняты на перапрацоўцы ільну.

МТС павінны прыняць рашучыя меры для ліквідацыі буйнейшых недахопаў у ходзе кампаніі, дапамагчы калгасам правільна арганізаваць перапрацоўку, зьнішчыць разрыў паміж апрацоўкай і здачай тэхкультур дзяржаве.

Плян ільназагатовак рэальны і павінен быць выкананы. МТС абавязаны ўзмацніць апэрацыйнае кіраўніцтва барацьбой за лён, даючы рашучы адпор кулацка-рвацкім тэндэнцыям і апартуністычным разважаньням аб нерэальнасьці плянаў.

Усю ўвагу—правільнай падачы апалу на БелДРЭС

13-га лютага, калі трэцяя зьмена БелДРЭС скончыла сваё дзяжурства, у кнізе дзяжурнага інжынэра зьявіўся нязвычайны запіс: «У выніку добрага гарэньня ў топках на працягу зьмены, падача нафты ў топкі спынілася і нават часамі спыняні работу аднаго вэнтылятара». Гэты запіс, зроблены рукой дзяжурнага інжынэра т. Кузьнецова, гаворыць аб поўным нерасьпе ў рабоце станцыі—ад поўнай разгрузкі да нормальнай загрузкі і, што больш дзіўна, **без нафты.**

Сапраўды, пераход рэзкі. Гарэньне ў топках у параўнаньні з тым, якое было за апошні час, можна назваць **зусім здавальняючым.** Станцыя даўно ўжо так не працавала. Пачынаючы з другой зьмены 13 лютага—на працягу 6 зьмен, без перапынку, ня было ні **адзай разгрузкі спажыўцоў.** Станцыя запазаньняла ўвесь вопыт у апэрацыі прадпрыемствах, якія яна абслугоўвае. Даўно ўжо ня было і такога мінімуму: 5850, 6200, 6000, 6300 кілёват. 14 лютага, пасьля доўгага перапынку, выпрацоўка станцыі дасягнула 168.500 кілёват-гадзін пры **нязначным выкананьні нафты.**

Амаль увесь гэты выпатак нафты пайшоў, галоўным чынам, на першую зьмену 14 лютага, але не з прычыны **вільготнасьці торфу.** А 5 гадзін працы ў правай топцы трэцяга катла зламалася шасьцярня. Гэта шасьцярня зарылася на віне старэйшага начатара Краўчанні.

Чым-жа тлумачыцца такое гарэньне ў топках і нізкая выпрацоўка энэргіі? Тлумачыцца гэта ключна палапшэньнем харчаваньня топак апалам. Замест сістэмацкага—арганізаванага, плянавага, роўнамернага загрузка бункераў розным відам апалу, рознай якасьці і вільготнасьці ў адпаведнасьці з тэхнічна ўгрунтаванымі рэцэптамі сумесі.

Праўда, у рабоце па складаньні і падачы сумесі няма яшчэ патрэбнай выразнасьці. Сэктар апалу БелДРЭС, на чале з інжынэрам Нажабрэцкім, не аддае яшчэ належнай увагі гэтаму пытаньню. Тав. Кажабрэцкі замест канцэнтраванага кіраўніцтва на асноўным вучастку—рэгуляваньні падачы апалу—займаецца вырашэньнем раду набочных пытаньняў, клопаты аб якіх ён мог свабодна карэнным чынам пакінуць. Ня выкананы яшчэ распарадзканьне тав. Прыгевіча (зьмена па БелДРЭС ад 12 лютага) аб устанаўленьні зьмешанага дзяжурства адказных асоб на бункерах для кіраўніцтва правільнай вывазкай апалу. Часам працэс сартаваньня парушаецца з-за адсутнасьці такой дробязі, як кавалак крэйды для ўказаньня на вагонэтцы гатунковасьці торфу (замест сартоўшчыка тав. Кучынскага). Ня ўсе яшчэ зьмены ў выкананьні гатунковасьці торфу, за правільнай расстаноўкай адпаведных паказальных шчыткоў.

Ад выразнасьці работы на гэтым вучастку залежыць бесьперабойная работа станцыі. Асноўная ўвага кіраўніцтва станцыі павінна быць зьвернута на правільную падачу апалу.

Выпуск брыгада «Зьвязды»—ПРАЎДЗІН, ІЛІЧ.

Не змагаюцца за павышэньне ўраджайнасьці!

ЧЭРВЕНЬ. Генэральная праверка падрыхтаванасьці да сэўбы, праведзеная РКК-РСІ і рэдакцыяй раённай газэты, выявіла, што барацьба за якасьць паказальнікі ў сельскай гаспадарцы, за павышэньне ўраджайнасьці яшчэ ня стала здабыткам усіх калгасаў Чэрвеньшчыны.

Як ідзе ссыпка насеньфонду? — у раёне ня ведаюць. Павоцце вестак НКЗ плян выкананя на 0,6 проц. У значнай частцы калгасаў збожжа яшчэ не абмалочана. Асабліва хронная справа з абмалотам канюшыны. У калгасах «Парыская Камуна», «Краіна Саветаў» (Вайніхаўскі сельсавет) і «Пуцілавец» (Валяжачаўскі сельсавет) адкладваюць абмалот канюшыны да вясны. Некаторыя калгасы безадказна аднесьліся да захаваньня насеньфонду. Так, калгас «Жывель» (Рудзянскага сельсавету) ссыпаў насеньне ў сьвірэн з ігракай страхой, у выніку чаго насеньне закірэла сьнегам.

Такое важнае мерапрыемства ў павышэньні ўраджайнасьці, як ачыстка насеньня, у цэлым радзе калгасаў нават не пачыналася («Краіна Саветаў», «Энэргія», «Чырвоная Зорка» і інш.).

На ст. Пухавічы для Чэрвеньскага раёну сабралася вялізарная колькасьць пшычнага ўчнасьню. Ня гледзячы на добрую санную дарогу, усё-ж яно ні адным калгасам не забрасецца. Таксама не скарыстоўваецца калгасамі санная дарога для вывазкі яшчэ на палі.

Райка і райкалгасаюз, якія абавязаны арганізаваць і ўзначаліць барацьбу калгасаў і саўгасаў за высокі сацыялістычны ўраджай, на справе яшчэ не ўзяліся за гэта як належыць, па-бальшавіцку. Аб адсутнасьці апэрацыйнага кіраўніцтва гаворыць тое, што райка нават ня мае вуноту аб засыпцы насеньфонду, ачыстцы насеньня і інш. мерапрыемствах па падрыхтоўцы да сэўбы.

Чэрвеньскі райком павінен неадкладна праверыць работу райка і райкалгасаюзу, абавязаць іх паладзіць апэрацыйнае кіраўніцтва ходам усёй падрыхтоўчай работы да весняной сэўбы.

Б. Х.

Прамтаварныя фонды выкарыстоўваюцца не па прызначэньні

ЧЭРВЕНЬ.

Чэрвеньшчына адстае ў выкананьні пляну ільназагатовак. На 1 лютага заданьне па валакне рэалізавана на 53,5 проц., ільнасеня—на 49 проц. На 15 лютага зрух вельмі нязначны.

Асабліва недапушчальным трэба лічыць адставаньне калгасаў, якія выкалі плян толькі на 47,3 проц. У некаторых калгасах у выніку кулацкай агітацыі лён разбазарваецца на ўласныя патрэбы.

Яшчэ горш справа з загатоўкай пянькі. У некаторых калгасах (калгас імя Леніна, Клінцоўскі сельсавет) пянька яшчэ ня жата.

Патрэбна прыняць рашучыя меры супроць тых кашпратараў, якія разбазарваюць прамтаварныя фонды і гэтым самым зрываюць ільназагатоўкі.

Адначасова неабходна быць упэўненым на барацьбе з асобнымі ільну у паасобных калгасах. Т. Л.

Пасяджэньні і рэзалюцыі замест справы

ШКЛОЎ.

На 10 лютага плян ільназагатовак па Шклоўскім раёне выкананя на 52,1 проц. Апошнія пяцідзесяці далі зусім нязначны прыр. Ільназавод з-за непадвозкі трасты працуе з перабоямі. Завод мае сыроду ўсяго на 10-12 дзён.

15 студзеня раённыя арганізацыі прынялі рэзалюцыі аб абвяшчэньні штурму ільназагатовак і на гэтым су заколіся. Вакол штурму ня была разгорнута масавая работы, не праведзены адпаведныя арганізацыйна-масавыя мерапрыемствы. Сакратар Чарнянскай партарэйкі Зайцаў на партсходзе заявіў: «Растлумачальная работы сярод бедняцкоў і серадняцкоў правесьці ня трэба, бо яны разумнейшыя за нас».

Ня цяжка зразумець, куды вядуць такія разважаньні. Адміністраваньне, падмена масавай работы вобыскамі—вось узгад работы «левых» загібшчыкаў тыпу Зайцава.

Ньвёрныя заданьні, паводле вестак райвыканкому, выкананы на 54,8 проц. Некаторыя сэкцыя органы мяк кацела адносіцца да кулакоў злосных зрыўшчыкаў ільназагатовак. Штрафы, якія накладваюцца на кулак спаганяюцца. Яшчэ 27 сьнежня мінулага году за незыкананьне заданьня па ільназагатоўках былі аштрафаваны кулак Афанасьеў, Таўкапеўскага сельсавету. Але да гэтага часу штраф не спаганы. У тойжа час у шкловскіх сельсаветах выяўлены факты галавацяпскага адміністраваньня ў адносінах да серадняцкіх гаспадарак. Работнікі, якія мабілізаваны райкомам і райвыканкомам для ўзмацненьня тэмпаў ільназагатовак, у значнай частцы знаходзяцца ў Шклове і не выяжджаюць у сельсаветы і калгасы.

Толькі 16,5 проц.

ВУШАЧЫ. (БЕЛТА).

Правераны рэйд гатоўнасьці калгасаў і саўгасаў да весняной сэўбы выявіў рад буйнейшых недахопаў. Калгасы Вушацкага раёну вельмі марудна ссыпаюць насенныя і страхавыя фонды. На 12 лютага плян ссыпкі насеньфонду тэхнічных культур у раёне выкананя на **16,5 проц.**

Стаўленьне з ачысткай і пратручваньнем насеньня яшчэ больш горшае. Раённыя арганізацыі нават ня маюць вестак аб колькасьці ачышчанага і пратручанага насеньня.

МТС, засылаючы ў сельсаветы і калгасы трыеры, не правяралі іх спраўнасьці. Па Масырскім сельсавеце ні адзін з калгасаў ня мог праводзіць ачыстку насеньня толькі таму, што МТС дасылала туды трыеры з цыліндрамі для ачысткі лянцы, на якіх нельга ачышчаць насеньня іншых культур.

У пратэсту барацьбы за насьпяховае праведзеньне весняной сэўбы, за высокі ўраджай паўна ўзяйсьці перш за ўсё своечасовае стварэньне насенных і страхавых фондаў, ачыстка і пратручваньне насеньня.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Няўхільна ажыцьцяўляць ленінскую нацпалітыку

„Задача далейшага разгорнутага наступленьня па ўсім фронце сацыялістычнага будаўніцтва патрабуе ад усёй КП(б)Б яшчэ большага ўзмацненьня барацьбы на два фронты—супроць ухілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць ухілу ў бок беларускага шавінізму, а таксама супроць шавінізмаў усіх масьцей і скажэньняў ленінскай тэорыі і практыкі ў нацыянальным пытаньні“ (з рэзалюцыі XIV ЗЬЕЗДУ КП(б)Б па справаздачы ЦК КП(б)Б)

Больш клясавай пільнасьці

Ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі ёсьць важнейшая ўстаўная частка агульнага змаганьня партыі і рабочай клясы за выкананьне грандыёзных задач сацыялістычнага будаўніцтва, вызначаных XVII усесаюзнай партканфэрэнцыяй.

На прыкладах пікоўкага росту народнай гаспадаркі Савецкай Беларусі, на прыкладах вялікарнейшых посьпехаў нацыянальна - культурнага будаўніцтва відавочна, як КП(б)Б, праводзячы ленінскую палітыку партыі ў нацыянальным пытаньні, з посьпехам ажыцьцяўляе задачу ліквідацыі эканамічнай і культурнай адсталасьці БССР.

Набытыя посьпехі на ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва, посьпехі будаўніцтва пралетарыяту па зямлеўпорадкаваньні і нацыянальнай на форме культуры — ёсьць просты рэзультат бязьлітаснай барацьбы КП(б)Б з ухіламі ў нацыянальным пытаньні.

Ухіл да вялікадзяржаўнага шавінізму, «які імкнецца рэвізаваць асновы ленінскай нацыянальнай палітыкі, і шад сьцягам інтэрнацыяналізму, прыкрываючы імкненьні ажываючых клясаў, паязваўшай ранней вялікадзяржаўнай нацыі, вярнуць сабе страчаныя прывілеі»—зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе.

У пастанове бюро ЦК і прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б ад 25 сьнежня 1931 г. аб узмацненьні барацьбы з ухіламі ў нацыянальным пытаньні, якая поўнасьцю ўхвалена XIV партзьездам з усёй сілай, з усёй выразнасьцю падкрэслена задача неабходнасьці ўзмоцненага далейшага разгортваньня работы мясцовых партарганізацый па беларусізацыі, абслугоўваньня нацыянальных меншасьцей, узмацненьня работы па інтэрнацыянальным выхаваньні, павышэньня клясавай пільнасьці і ўзмацненьня барацьбы супроць ухілаў і ў першую чаргу супроць ухілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму, які праяўляе сабой галоўную небясьпеку на даным этапе, а таксама супроць беларускага шавінізму і шавінізму ўсіх колераў.

З часу апублікаваньня гэтай пастановы прайшло каля двух месяцаў. Між тым, яшчэ да гэтага часу ня ўсе мясцовыя партарганізацыі ўзяліся, як належыць, за яе практычнае ажыцьцяўленьне. Допісы з месц, якія сёньня зьмяшчаюцца, сьведчаць аб тым, што асобныя партарганізацыі, асабліва арганізацыі навучальных устаноў (тэхна - мэліярацыйны інстытут Горацкай с.-г. акадэміі, інстытут савбуду і ціква, рабфак будаўнічага інстытуту) недаацениваюць усёй палітычнай важнасьці ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі. У радзе выпадкаў нагляпаецца фармальныя адносіны да правядзеньня беларусізацыі, адсутнасьць работы па інтэрнацыянальным выхаваньні мас. Невыстарчальна вядзецца барацьба з ухіламі ў нацыянальным пытаньні і рознымі праяўленьнямі шавінізму.

Пасыўнае і актыўнае супраціўленьне правядзеньню беларусізацыі ёсьць нішто іншае, як адзін з відаў праяўленьня вялікадзяржаўнага шавінізму. Важнейшай умовай перамаганьня гэтага клясава-варожага праяўленьня зьяўляецца ўпартае, сыстэматычнае правядзеньне беларусізацыі, шырока разгорнутая работа па аўладаньні беларускай мовай, па вывучэньні гісторыі эканомікі Савецкай Беларусі.

Для рэалізацыі сьнежаньскай пастановы бюро ЦК і прэзыдыуму ЦКК, зацьверджаным XIV зьездам КП(б)Б аб узмацненьні барацьбы з ухіламі ў нацыянальным пытаньні, якая поўнасьцю ўхвалена XIV партзьездам з усёй сілай, з усёй выразнасьцю падкрэслена задача неабходнасьці ўзмоцненага далейшага разгортваньня работы мясцовых партарганізацый па беларусізацыі, абслугоўваньня нацыянальных меншасьцей, узмацненьня работы па інтэрнацыянальным выхаваньні, павышэньня клясавай пільнасьці і ўзмацненьня барацьбы супроць ухілаў і ў першую чаргу супроць ухілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму, які праяўляе сабе махровымі шавіністамі асыстэнт Зьтман, бібліятэкар Казлова і інш. Рад студэнтаў Рэвут, Букацька, Дубровенская, Радзінава ўпарта супраціўляюцца правядзеньню беларусізацыі.

У асеньнім наборы мінулага году прынята ў Індынстытут больш 400 чалавек. Між тым ніякай работы па інтэрнацыянальным выхаваньні сярод іх не праводзіцца. На праяўленьні вялікадзяржаўнага шавінізму арганізацыі інстытуту ня рэагуюць адпаведным чынам.

Дырэктар індынстытуту Воўкаў не згадзяецца з вываламі камісіі, зробленымі ў адносінах да яўных шавіністаў, прымірэнча адносіцца да клясава-варожых праяўленьняў. Трэба весьці самую бязьлітасную барацьбу супроць усякіх праяўленьняў шавінізму, супроць усякіх ухілаў ад ленінскай лініі партыі ў нацыянальным пытаньні.

П.

Зламаць апартуністычнае супраціўленьне беларусізацыі

«Павысіць пільнасьць да вылазак і праяўленьняў вялікадзяржаўнага ўхілу, як галоўнай небясьпекі на даным этапе і арганізаваць яшчэ больш актыўную барацьбу з ім, наносячы рашучы ўдар па апартуністычным і абыватальскім прымірэнцтве да вялікадзяржаўнага шавінізму» — такую задачу высунулі перад усімі партарганізацыямі ЦК і прэзыдыум ЦКК КП(б)Б сваёй пастановай аб узмацненьні барацьбы з ухіламі ў нацпытаньні.

Трэба сказаць, што гэтая задача кіраўніцтвам і партарганізацыяй водна-мэліярацыйнага інстытуту Горацкай сельска-гаспадарчай Акадэміі ажыцьцяўляецца надзвычай слаба. Аб гэтым гаворыць ужо той факт, што большасьць студэнтаў інстытуту зусім ня ўжываюць беларускай мовы на занятках. Канспэкты складаюцца пераважна на расійскай мове. Належных захадаў для сапраўднага правядзеньня беларусізацыі з боку кіраўніцтва інстытуту ня прымаецца.

Масавы вечар, прысьвечаны дню ўдарніка, праводзіўся за выключэньнем урачыстай часткі на расійскай мове. Была паказана пастаноўка «Квадратура круга» на расійскай мове. Частушкі таксама прыпадносіліся на расійскай мове. Паогул кажучы, гэты вечар паказаў, як і рад іншых фактаў з жыцьця інстытуту, яўнае ігнараваньне беларускай мовы, што нельга інакш расьцэньваць, як праяву вялікадзяржаўнага шавінізму. Бюро партколектыву не мабілізуе студэнцкія масы на барацьбу з праяўленьнямі вялікадзяржаўнага шавінізму і ўхілу да яго, як галоўнай небясьпекі на даным этапе. Пасьцен газэта інстытуту «За пралетарскія кадры» таксама ні ў якай меры не завастрае ўвагі грамадзкасьці на задачах практычнага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Н. Каржанеўскі
Н. Маргуноў.

Улічыць недахопы

«Асабліва дрэнна стаіць справа з беларусізацыяй на чыгунцы, пошце, дзе больш за ўсё жывучы рэшткі старога бюракратычнага апарату, дзе лічаць непатрэбным веданьне і ўжываньне ў сваёй рабоце беларускай мовы, дзе праяўляюць па справе супраціўленьне беларусізацыі. Вельмі дрэнна стаіць справа з масавай работай прафсаюзаў нават у тых галінах прамысловасьці, дзе рабочыя ў скаім складзе зьяўляюцца і большасьцю беларусамі». Гэта характарыстыка кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б (1930 год) цалкам адпавядае і на сёньняшні дзень становішчу работы ў галіне правядзеньня беларусізацыі на Аршанскім чыгуначным вузле. Адміністрацыйна-гаспадарчае кіраўніцтва вузла пасыўна адносіцца да справы беларусізацыі і гэтым самым патурае праяўленьням вялікадзяржаўнага шавінізму. Інжынэр эканамікі Казловіч знаходзячыся ў радах партыі праявіў сябе як ухіліст да вялікадзяржаўнага шавінізму. Ён самым пахабным чынам ігнаруе беларусізацыю. Між тым Казловіч на сустрэчу сваячасова рапучага адпору з боку парт'ячэйкі раёну.

Наколькі недаацэньваецца справа беларусізацыі на чыгуначным вузле відаць з таго, што ў клюбах усіх прафсаюзных аб'яднаньняў вузла ёсьць зусім нязначная колькасьць беларускай літаратуры. Таксама стаіць справа з выпускам газэт на беларускай мове. У некаторых службах (служба руху, цягі, кандуктарскі рэзэрв), дзе налічваюцца многія сотні і нават тысячы людзей, «Зьвязды» выпісваецца толькі дзесяткі экземпляраў.

Усе гэтыя недахопы ў практычным ажыцьцяўленьні нацпалітыкі неабходна ўлічыць. Партарганізацыя павінна па-бальшавіцку мабілізавацца на практычнае правядзеньне ў жыцьцё беларусізацыі, на бязьлітасную барацьбу супроць ухілу да вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, беларускага шавінізму і шавінізмаў іншых колераў.

Грушаноў, Ярмоленка

Фармальны падыход

У інстытуце савбуду і права слаба праводзіцца работа па выкананьні дырэктыў партыі аб беларусізацыі. Існаваўшы раней гурток па вывучэньні беларускай мовы зараз развалуўся. Праверка беларусізацыі ў інстытуце была пачата з вялікім спазьненьнем, праведзена фармальна без належнай мабілізацыі мас на ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі.

У пачатку гэтага месяца на агульным сходзе партколектыву абмяркоўваліся вынікі праверкі беларусізацыі. Замест таго, каб у парадку самакрытыкі сапраўды выкрыць недахопы сваёй работы ў гэтым напрамку, каб мабілізаваць усе свае сілы на выкананьне гэтай важнейшай палітычнай задачы партыі, рад кіруючых работнікаў імкнуліся сваімі выступленьнямі змазаць сапраўднае становішча справы правядзеньня беларусізацыі. Ва многіх выступленьнях адчувалася зусім вузкае, няправільнае разуменьне беларусізацыі, — як толькі вывучэньне беларускай мовы. Спасылаючыся на адзнакі, зробленыя аб тым, у якой ступені той ці іншы студэнт аўладаў беларускай мовай, рад таварышоў — Дарашкевіч, Шкатула і інш. імкнуліся давесьці, што ў справе беларусізацыі ўсё стаіць добра.

Паогул усе гэтыя факты сьведчаць аб фармальным падыходзе кіруючых арганізацый інстытуту да ажыцьцяўленьня беларусізацыі.

П-ы.

УЗМАЦНЕНЬНЕ ПРАЦДЫСЦЫПЛІНЫ
ЗАРУКА ПАСЬПЯХОВАЙ РАБОТЫ ЧЫГУНАЧНАГА ТРАНСПАРТУ

Неабходная ўмова ўздыму транспарту

Справа крушэньня на ст. Косіна паказала ўсяму пралетарыяту Савецкага Саюзу, да чаго даводзіць адсутнасьць працоўнай дысцыпліны.

Моцная працоўная дысцыпліна, як паказала ў загадзе тав. Андрэева, зьяўляецца асноўнай умовай уздыму транспарту.

Здарэньні, паўторнасьць у рамонце, несвачасовае адпраўленьне цягнікоў, спыненьні ў дарозе, зрывы спаранай, прагулы — вось яны, паказальнікі адсутнасьці працоўнай дысцыпліны, разгільдзяйства, безадказнасьці.

За апошні час на чыгунках БССР нагляцаецца значнае аслабленьне працоўнай дысцыпліны. Асабліва нездавальняючае становішча ў Віцебскім раёне. У студзені, напрыклад, у гэтым раёне было 240 здарэньняў, прычым спыненьняў цягнікоў у дарозе — 157. За адну толькі першую дэкаду лютага было 101 здарэньне. На Віцебскім дэпо адзначаецца рост паўторнасьці рамонту і павялічэньне выпадкаў зрыву спаранай. Становішча на Віцебскім рабіе прымушае настаражыцца. Апартуністычнае ігнараваньне палітычна-масавай работы, адсутнасьць паказу і захвочваньня лепшых ударнікаў зьяўляюцца асноўнымі прычынамі нізкай працоўнай дысцыпліны на вузлах. Партыйныя, прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі не ўзначалілі па некаторых вучастках барацьбы за сацыялістычныя адносіны да працы, за комуністычную пралетарскую дысцыпліну. Іх увага павінна быць на бліжэйшы час прыкавана да пытаньняў узьяўленьня дысцыпліны на ўсіх вучастках работ.

У пастанове ЦК УсеКП(б) ад 10 студзеня 1931 году аб транспарце падкрэслена: **«Правесьці рашучыя меры па ўзьняцьці працдысцыпліны ў першую чаргу сярод членаў партыі, ня спыняючыся перад зьняцьцем і выключэньнем з партыі дэзарганізатараў, хвасьцістаў, ня выконваючых партыйных дырэктыў».** Трэба проста сказаць, што ва многіх месцах гэта пастанова рэалізуецца нездавальняюча. З гэтым пара пакончыць.

Трэба ўжываць увесь комплекс мер барацьбы за цьвёрдую працоўную дысцыпліну, адначасова шырока разгортваючы масавую выхаваўчую работу. Чаму ня ўжываць форму скліканьня парушыцеляў працдысцыпліны па прыкладзе Аршанскага дэпо, дзе абгаварваліся канкрэтныя факты парушэньняў? Чаму не праводзіць нарад старых і новых кадраў? Чаму не арганізоўваць культвечары па пытаньні працдысцыпліны, не абгаварваць выпадкаў парушэньняў на вытворчых нарадах? Усе формы масавай работы павінны быць застасаваны да работы па ўзьняцьці дысцыпліны.

Павінна быць узмоцнена клясавая пільнасьць па выяўленьні і выкрыцьці перад усімі тварэ клясава-чужых элемэнтаў, якія пралезьлі на транспарт і дэмаралізуюць працдысцыпліну.

Вышэй ўзьнімаючы хвалю сацыялістычнага спаборніцтва, змагаючыся бязьлітасна з правымі і «левымі» апартуністамі, чыгуначныя арганізацыі павінны забясьпечыць павышэньне працоўнай дысцыпліны на транспарце.

Паўторнасьць рамонту і спазьненьні цягнікоў --біч Магілеўскага вузла

Магілеўскі вузел у студзені дасягнуў некаторага паляпшэньня ў рабоце. Процант хворых паравозаў зьнізжан да 12,6 пры заданьні ў 13,9 проц. Прастой паравозаў у рамонце зьнізжан на 5%. Рад паравозных брыгад дабіўся значнай эканоміі апалу. Паравоз № 613, Янжэнкі і Ісаева, які прымаў удзел ва ўсесаюзным конкурсе, з'эканоміў 21,54 тоны вугалю, паравоз № 1.654 з'эканоміў 6,6 тоны, № 1.682—6,5 тоны, камсамольская брыгада паравоза № 5.088 з'эканоміла 3,7 тоны.

Побач з гэтымі станоўчымі фактамі рад вымяральнікаў яшчэ ня выконваецца. Асабліва павялічыліся паўторнасьць рамонту паравозаў і спазьненьні цягнікоў. За студзень у Магілеўскім дэпо быў 31 выпадак паўторнасьці рамонту і гэта пры тых умовах, калі паравоз замест 6-ці дзён паводле нормы прастойвае ў рамонце 12-13 дзён. На барацьбу з гэтым не мабілізавана грамадзкая думка.

За студзень быў 81 выпадак нявыхаду на работу, 29 спазьненьняў цягнікоў у дарозе.

Шырэй разгортваючы сацэпаборніцтва і ўдарніцтва, узмацняючы працоўную дысцыпліну, па-бальшавіцку рэалізуючы 6 умоў тав. Сталіна, перанесьці цэнтр работы ў цэх, брыгаду, групу, чыгуначныя арганізацыі Магілеўскага вузла дабіцца перамогі.

А. Стасенка.

Кіраўніцтва Віцебскага дэпо не перабудавала работы

Дырэктыва партыі аб замацаваньні спаранай ямы, палепшэньні якасьці рамонту, свачасовым адпраўленьні і сьледаваньні цягнікоў па раскладзе яшчэ дрэнна рэалізуюцца VI эксплёатацыйным раёнам (Віцебск) МБВ чыгункі.

Кіраўніцтва дэпо ў вестках аб спаранай дапускала яўнае «очковтирательство». Брыгада НКПЗ выявіла, што фактычна ў лістападзе зрывы спаранай ямы па найважлівых прычынах дасягнулі 29,6 проц. супроць 15,9 проц., якія былі паказаны ў «зводках» дэпо. За 15 дзён сьнежня зрыў спаранай па пасажырскіх і таварных паравозах раўняўся па найважлівых прычынах 30 процантам, замест паказаных 16,2 проц. Некаторыя паравозы ўвесь час працуюць зусім абязьлічана. Напрыклад, на паравозе Э—5459 у сьнежні езьдзіла 5 машыністаў, 10 памочнікаў і 9 качагараў, на паравозе Э—6024—5 машыністаў, 3 памочнікі і 4 качагары, на паравозе С—56 — 4 машыністы, 4 памочнікі і 11 качагараў, на паравозе Щ — 747 — 8 машыністаў, 5 памочнікаў і 10 качагараў. Колькасьць такіх выпадкаў можна павялічыць.

10-га студзеня на пасажырскіх паравозах зрыў спаранай ямы дасягнуў 45,5%. Адной з прычын, якая мае вялікі ўплыў на замацаваньне спаранай ямы, зьяўляецца цякучасьць кіраўнікоў паравозных брыгадаў. Толькі за апошнія тры месяцы зьмянілася 6 кіраўнікоў. Апрача адміністрацыйных спачуваньняў, ніякай культурна-масавай і выхаваўчай работы не вядзецца.

Прамывачны пэх дэпо Віцебск увесь час адстае ў рабоце. У сьнежні былі адрамантаваны 252 паравозы, а прапушчана праз прамыўку толькі 75. Паогул паўторнасьць у рамонце дасягнула рэкорднай лічбы — 225 выпадкаў. Паравозы затрымліваліся ў рамонце супроць норм на 100 і больш гадзін. У пачатку студзеня паравоз С—67 прастаяў на гарачай прамыўцы на 106 гадзін больш заданай нормы, паравоз Щ —59 — на 82 гадзіны і г. д.

З прычыны ігнараваньня масава-выхаваўчай работы і адсутнасьці падрыхтоўкі, абвешчаны конкурс на лепшую рамонтную брыгаду ў прамывачным цэху быў правален. З 200 рабочых цэху ўдарнікаў налічваецца толькі 58.

Пасобныя дажурныя дэпо агідна і злачынна адносяцца да выкананьня сваіх абавязкаў. Дажурны па дэпо Высоцкі 21-га студзеня ўтаіў выдачу паравоза пад цягнік № 101 са спазьненьнем на адну гадзіну. Дажурны па дэпо Дуцкі ў той жа самы дзень выдаў са спазьненьнем паравоз пад цягнік № 86.

У ступенчатым дэпо графік работы таварных паравозных брыгад адсутнічае. Намесьнікам начальніка дэпо Віцебск па рамонце «працуе» тав. Станкевіч, які ў свой час пастановай ЦК КП(б)Б быў зьнят з працы ў дэпо Ворша за бесгаспадарчасьць.

Тав. Станкевіч на рабоце сябе не апраўдвае. У рамонце існуе бесгаспадарчасьць і бясплянавасьць.

Трэба прыняць рашучыя захады на палепшэньня работы дэпо шляхам паладжаньня штодзённага апэрацыйнага кіраўніцтва, правільнай расстаноўкі сіл і безадкладнай рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна. Людзі, якія не апраўдваюць давер'я партыі, павінны быць зьняты з кіруючай работы.

Ангірскі.

СТВАРАЕМ УСЕБЕЛАРУСКІ ЦЭНТР САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ НАВУКІ

(Гутарка з прэзыдэнтам Беларускай Акадэміі Навук т. П. ГОРЫНЫМ)

Пастанова ЦК КП(б)Б ад 29 студзеня г. г. аб рабоце Беларускай Акадэміі Навук мае вялізарнае значэньне для далейшага разьвіцьця Акадэміі і пашырэньня на вышэйшую ступень усёй навукова-дасьледчай работы ў БССР.

Нам добра памятна, як вялікадзяржаўніцкія і нацыянал-дэмакратычныя элемэнты рэагавалі на ачышчэньне БАН ад агентаў клясавага ворага. Тады яны шырока распаўсюджвалі чуткі, што Акадэмія дажывае свае апошнія дні і г. д. КП(б)Б і пад яе кіраўніцтвам пралетарская грамадзкасьць цалі рашучы адпор гэтым варожым антыпралетарскім настроям.

Пастановаю ЦК КП(б)Б ад 13 мая 1931 году перад Акадэміяй былі пастаўлены задачы ператкаваньня яе ў адзіны рэспубліканскі навуковы цэнтр, якому даручаецца плянаваньне і кантроль над усёй навукова-дасьледчай работай БССР. Партыя тады моцна ўдарыла па руках утыліста ў бок вялікадзяржаўнага і беларускага шавінізму, якія імкнуліся дыскрэдытаваць Акадэмію, разьбіваць і згарнуць яе навуковую работу. У адказ на падобныя вялікадзяржаўніцкія і нацыянал-дэмакратычныя вылазкі, у Акадэмію былі пасланы лепшыя навуковыя марксыцкія сілы. У дны момант у Акадэміі камуністычная праслойка сярод навуковых работнікаў складае 44 проц., а раней яна была зусім нязначнай.

Студзеньская пастанова ЦК КП(б)Б адкрывае перад Акадэміяй яшчэ больш перспэктывы разьвіцьця. Падкрэсьліваючы, што работа Беларускай Акадэміі Навук павінна праводзіцца на аснове ажыцьцяўленьня ўказаньняў тав. Сталіна і шчыльнай сувязі з сацыялістычным будаўніцтвам, разьлецьця ЦК КП(б)Б гаворыць аб цэлым радзе **практычных мерапрыемстваў, якія забясьпечваюць арганічную увязку навукі з сучаснасьцю.**

Ставячы пытаньне аб далейшым укамплектаваньні Акадэміі марксыцкімі навуковымі кадрамі, рэзалюцыя ЦК КП(б)Б зусім правільна канцэнтруе асноўную увагу на арганізацыі працы навуковых работнікаў. На жаль, мы па гэтага часу яшчэ не заволі рашуча змагаемся супроць шырока распаўсюджанага зьявішча **сумяшчальніцтва** навуковых працаўнікоў у шмат якіх установах, што часта прыводзіць да зрыву работы.

На аснове пастановы ЦК КП(б)Б, прэзыдыум Акадэміі зараз правядзе нагрузку сваіх навуковых работнікаў з тым, каб іх работа працікала толькі ў сьценах Акадэміі лагчокаючы пры гэтым норму пэдагагічнай работы ў размеры, якая не перашкаджала б асноўнай, навуковай рабоце.

Асаблівую ролю адыгрывае пастанова ЦК КП(б)Б аб рэалізацыі Акадэміяй пастановы Саўнаркому ад 18 мая па плянавым навукова-дасьледчай работы ў БССР. Правядзеньне ў жыцьцё гэтай пастановы Саўнаркому мае вялізарнае значэньне ў сувязі з цэлай увязкі навукова-дасьледчай работы з сучаснасьцю. У даны момант у Акадэміі сабраны пляны работы ўсіх навуковых устаноў БССР. Пляпава-арганізацыйны сэктар Акадэміі гэтыя пляны ўжо разглядзеў і робіць сваё заключэньне. Апрача таго, на працягу году на прэзыдыуме будуць заслухоўвацца справаздачы навуковых устаноў БССР.

Важнай задачай Акадэміі зьяўляецца кантроль над тым, як ажыцьцяўляецца навуковыя дасьледаваньні. Мы ідзем шмат выпадкаў, калі навуковыя ажрыцьці Акадэміі, якія маюць вялізарнае гаспадарчае значэньне, не скарыстоўваюцца нашымі ўстановамі. Пастанова ЦК КП(б)Б аб уключэньні дырэктароў інстытутаў БАН у склад навукатаў, або адпаведных гаспадарчых устаноў дасьць магчымасьць сачыць за тым, як навуковыя дасьледаваньні сваячасова выкарыстоўваюцца ўстановамі ў іх апэрацыйнай рабоце.

Акадэмія ў гэтым годзе ставіць як баявую задачу шырока разгарнуць масавую работу па правядзеньне навуковых і тэхнічных веданьняў. Толькі ў цесным сувязі з шырокай працоўнымі масамі можна сапраўды справіцца з задачамі, якія стаяць перад БАН.

Студзеньская пастанова ЦК КП(б)Б мае вялізарнае значэньне для далейшага разьвіцьця Акадэміі. Яна ставіць рад вуздлавых задач у справе далейшага разьвіцьця навуковай работы ў БССР і ператварэньні Акадэміі ў сапраўдны цэнтр беларускай сацыялістычнай культуры, вызначае задачы па падрыхтоўцы новых навуковых кадраў і бальшавіцкіх адносін да беспартыйнай савецкай інтэлігенцыі, пашырэньні ячэйкі навуковых ведаў нашых работнікаў і г. д.

У даны момант у інстытутах і сэктарах Акадэміі рэзалюцыя ЦК шырока абгаварваецца і, у сувязі з гэтым, ажыцьцяўляецца цэлы рад практычных мерапрыемстваў. Наша задача заключэцца ў тым, каб рэзалюцыя ЦК КП(б)Б чым хутчэй палкам выканаць. У гэтых адносінах Акадэмія чакае самага шырокага падтрыманьня з боку савецкай грамадзкасьці.

(БЕЛТА).

Аб рабоце навукова-дасьледчага інстытуту сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі імя Леніна

Пастанова аб'яднанага пасяджэньня прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б і калегіі НК РСІ БССР

Адзначыць, што ў навукова - дасьледчай працы інстытуту ёсьць паварот у бок распрацоўкі тэм сацыялістычнага будаўніцтва (спэцыялізацыя сельскай гаспадаркі, разьмяшчэньне МТС, распрацоўка пытаньняў другой пяцігодкі, вывучэньне кармоў і г. д.).

Аднак, агульнае становішча работы НДІ яшчэ не забясьпечвае выкананьня вялізарных задач выключна тэарэтычнай і палітычнай важнасьці, пастаўленых партыяй і яе правадыром тав. Сталіным на аграрным фронце.

Канстатаваць, што інстытут у барацьбе за марксыцка-ленінскую ідэалёгію праўёў значную работу па выкрыцьці клясава - варожых «тэорый» (кандрацьеўшчына, нацдэмакратызм, тэорыя Вэбэра), але НДІ яшчэ ў належнай меры не здолеў па-бальшавіцку рэалізаваць у штодзённай канкрэтнай рабоце гістарычныя ўказаньні тав. Сталіна на першай канфэрэнцыі аграрнікаў-марксыстаў, яго шасьці ўмоў і апошняга ліста ў рэдакцыю часопісі «Пролетарская революция» і што гэтыя дакументы ня сталі праграмай навукова - дасьледчай дзейнасьці інстытуту.

НДІ ня змог у сваёй практычнай рабоце наладзіць сувязь з шырокімі колямі рабочай і калгаснай грамадзкасьці, спэцыялізаванымі галінамі навукова - дасьледчымі станцыямі і інстытутам. Апорныя пункты—саўгасы, калгасы да гэтага часу яшчэ ня сталі базай навукова-дасьледчай работы. Вопыт работы апорных пунктаў слаба папулярызуецца сярод грамадзкасьці.

Працуючыя, выпушчаная НДІ, не гаворачы аб малой колькасьці, з пункту гледжаньня марксыцка - ленінскай мэтадалёгіі ня зусім вытрыманая, а ў радзе месц дапушчаны палітычныя памылкі. Выданая брашура Булгака — **«Стан трактарызацыі і механізацыі сельскай гаспадаркі БССР»** у агульных вывадах дае палітычна -шкодныя тлумачэньні аб мэханізацыі і трактарызацыі сельскай гаспадаркі БССР. НДІ пры распрацоўцы тэмы «Разьмяшчэньне МТС» папусьціў палітычную памылку, недаацаніўшы арганізуючай ролі МТС. Па мыкоўвыя мэтадалёгічныя ўстаноўкі інстытутам ня былі раскрытыкаваны сярод пралетарскай і калгаснай грамадзкасьці.

Асабліва трэба адзначыць, што ня гледзячы на дырэктывы партыі аб правядзеньні ленінскай нацпалітыкі, інстытутам, бюро парт'ячэйкі гэтыя ўказаньні партыі не пастаўлены на належную прынцыповую палітычную вышыню. Невыстарчальна праводзіцца беларусізацыя. Некаторыя супрацоўнікамі ня ўжываецца беларуская мова. Пасобныя навуковыя супрацоўнікі (Броўкін—член КП(б)Б) сталі на шлях прымірэнчых адносін да адкрытага выступленьня махровага вялікадзяржаўнага шавініста Палавога, які, будучы навуковым работнікам НДІ, падаў заяву аб нежаданьні працаваць таму, што «естественно - исторические условия БССР и язык создают большое усложнение в работе» і чаго гэты «вучоны» «при всем желании органически выдержать не в состоянии» (заява Палавога ад 28 лістапада 1931 году).

Махровая вылазка вялікадзяржаўнага шавініста Палавога, прымірэнчыя адносіны да яе з боку Броўкіна, сямейнасьць групы супрацоўнікаў — інстытутам і бюро парт'ячэйкі ня былі выкрыты ў выніку таго, што бальшавіцкая крытыка і самакрытыка ва - варожых лініі на аграрным фронце, шырока разгарнуўшы крытыку сярод рабочай і калгаснай грамадзкасьці палітычна - шкодных памылак, дапушчаных у працах НДІ. Рашуча пераробудаваць усю работу ў напрамку аўладаньня мэтадалёгіяй засавальнікаў марксызму і ленінізму, узмацніўшы агонь супроць працягваньня трацкісцкіх, кантрабандысцкіх і правахілецкіх тэорый у навуцы.

4. Прапанаваць дырэкцыі інстытуту наладзіць мэтадалёгічнае кіраўніцтва падпарадкаванымі дасьледчымі ўстановамі па рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, каардынацыі плянаў іх работ, супольнай прапрацоўцы заданьняў і кансультацыі. Асабліва завастрыць увагу на рабоце апорных пунктаў, арганізаваўшы шырокі абмен вопытам ленінай пастаноўкі работы ў калгасах і саўгасах.

5. Прапанаваць Наркамзему і Калгасцэнтру ў мэтах канкрэтызацыі работы НДІ, ажыцьцявіць сапраўднае кіраўніцтва апорнымі пунктамі, сувязь з шырокімі колямі саўгасных рабочых і калгасьнікаў, разбуйніць сфэру дзейнасьці НДІ шляхам неадкладнай рэалізацыі пастановы лістападаўскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб арганізацыі навукова - дасьледчага аграрнага калгаснага інстытуту, як філіялу ІНКІ (Масква).

6. Адзначаючы, як дасягненьне ў рабоце НДІ, арганізацыю інстытуту асьпірантуры, прэзыдыум ЦКК і калегія НК РСІ прапануюць пераследзець плян падрыхтоўкі з мэтай узмацненьня партыйнасьці і якасьці аўладаньня тэхнікай спэцыялізацыі ў выхаваньні кадраў, падбору высока - кваліфікаваных выкладчыкаў, адкавеванай сувязі тэарэтычнай падрыхтоўкі з практыкай сацыялістычнага будаўніцтва, ліквідаваўшы абязьлічку ў вызначэньні спэцыяльнасьці кожнага асьпіранта.

7. Адзначаючы, што сучаснае становішча навуковых кадраў НДІ далёка не забясьпечвае выкананьня вялізарнейшых задач па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, даручыць НКЗЗ паставіць пытаньне перад ЦК КП(б)Б аб узмацненьні інстытуту адпаведнымі кадрамі.

8. Прапанаваць інстытуту разгарнуць работу па ажыцьцяўленьні ленінскай нацпалітыкі па аграрных пытаньнях, якія разгледзеў, выхаваньні кадраў шляхам прапрацоўкі спэцыяльных тэм па нацыянальна-культурным будаўніцтве праз гурткі, узмацненьні беларусізацыі, павёўшы бязьлітасную барацьбу супроць ухілаў ад ленінскай нацпалітыкі і прымірэнцтва да іх.

9. Прыняць да ведама заяву дырэктара НДІ аб тым, што Палавы звольнен з работы. Прапанаваць інстытуту, сумесна з грамадзкімі арганізацыямі, у двухдзённы тэрмін даць разгорнутую крытыку ў друку навуковай дзейнасьці Палавога, як выяўленага махровага вялікадзяржаўнага шавініста.

10. Выяўленыя ў часе абсьледаваньня на інстытуту кампрамэтуючыя матар'ялы адносна членаў партыі Броўкіна, Пікуліна, Малочкі і Дзьмітрава па пытаньні сямейнасьці і невыкрыцьцю сувязі з клясава - чужым элемэнтам, даручыць кіраўніку сацыяльна - культурнай групы тав. Ерафееву справу аб іх перадаць парткалегіі ЦКК.

11. Прыняць да ведама заяву дырэктара інстытуту Ганіна аб прыманьні несвачасовага выкрыцьця ім палітычнай памылкі «лявацкага» васкоту на ЦК КП(б)Б у пытаньнях барацьбы з нацдэмакратызмам. Абавязаць тав. Ганіна ў бліжэйшы час пасьля разгорнутую крытыку ў друку гэтых памылак.

12. Прапанаваць бюро парт'ячэйкі разгарнуць масавую работу, мабілізаваўшы ўсю грамадзкасьць інстытуту па выкананьне і перавыкананьне плянаў работы, укаранёньне посьпехаў навукі ў практыку дзейнасьці саўгасаў і калгасаў, шырока разгарнуўшы бальшавіцкую крытыку і самакрытыку ва ўсёй рабоце, бязьлітасна змагаючыся з усялякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі, асаблівую ўвагу накіраваць супроць галоўнай небясьпекі — правага апартунізму, узмацніўшы барацьбу з трацкісцкай кантрабандай у навуцы.

Нам. Наркома ЦКК-РСІ БССР
Гурэвіч.

БАРАЦЬБА ЗА ЯКАСЬЦЬ—

АСНОЎНАЕ ЗЬВЯНО СЕЛЬГАСМАШЫНАБУДАЎНІЦТВА

Ліквідаваць залежы незавершанай прадукцыі і брак дэталяй на Гомсельмашы і „Чырвоным мэталісьце"

Брак прадукцыі зрывае выкананьне прамфінпляну

ВІЦЕБСК. Студзеньская праграма машынабудаўнічага заводу «Чырвоны мэталіст» выкавана на 93.4 проц. Ва першыя дзесяць дзён лютага прамфінплян заводу выкаран усяго на 67,87 проц.

Трэба адзначыць, што 80 проц. усяго рабочага часу за гэтыя 10 дзён асноўныя цэхі заводу прасталі з-за недахвату электраэнэргіі па віне БелДРЭС. Але выкананьню вытворчай праграмы таксама значна перашкодзіў вялікі брак прадукцыі, асабліва ў ліцейным цэху. Брак па брыгадзе жмыхадрабілак за студзень дасягнуў 12,6 проц., па корнярэзках—13.54 проц., па бульбакапалках — 20,54 проц., па сячкарнях — 13,67 проц., па брыгадзе, якая вырабляе дэталі для плугоў «Эбэргардт»,—32.68 проц., па чыгунных запасных частках — 41,5 проц (паводле пляну дапускаецца брак ня вышэй 10 проц.). Большасьць браку прыпадае на фармоўшчыкаў. Сярэдні брак за студзень па ліцейным цэху дасягае 14 проц. У першыя дні лютага гэта лічба ўзьнялася. Вялікая доля віны падае тут на адміністрацыю.

Большасьць апок і мадэляў пасавалася, але іх не рамонтуюць. Зямля для фармоўкі прасейваецца нерэгулярна і не праз густое сіто, як гэта трэба. Дагэтуль не адпуканы спэцыяльны вучастак для снабжэньня ліцейнага цэху адпаведнай фармовачнай зямлёй.

Больш доўх месяцаў, як рабочыя паказалі брыгадзіру **Жукоўскаму** на неабходнасьць хутчэйшага рамонту машыны па фармоўцы зорачак да жмыхадрабілак. Але, ня гледзячы на гое, што брак па зорачках прыняў пагражаючы характар (былі выпадкі, калі з 285 зорачак аказвалася бракаваных 85), меры да рамонту машыны ня прымаюцца. Шмат браку дае фармоўка плянэтных скрынак да бульбакапалак, з прычыны непадгатоўкі на вытворчасьці, але адміністрацыя ня прымае ніякіх мер, каб палепшыць работу.

Зусім недапушчальным зьяўляецца тое, што адміністрацыя не клапоціцца аб рамонце даху ліцейнага цэху-часта бывае, што вада праз дах трапляе на апокі і псуе фармоўку, у выніку пасьля адліўкі атрымліваецца шмат браку.

Побач з гэтым трэба адзначыць вялікую колькасьць дрэннай прадукцыі па віне самых рабочых. Так, фармоўшчык **Куляшоў** з 20 валаў зрабіў 6 бракаваных, **Казлоў** з 30 заднік сьценак папяраджальных скрынак—9 бракаваных. **Цяцераў** з 200 зорачак да жмыхадрабілак — 69 бракаваных.

Вялікую колькасьць папсаванай прадукцыі выпускае і такарны цэх. З прычыны адсутнасьці рацыяналізацыі на зборцы, некалькі дзесяткаў плянэтных скрынак да бульбакапалак былі забракаваны.

Узорная работа лепшых ударнікаў т. т. **Ластачкі, Бондарава, Мутоўцына, Чэкіцава** і інш., якія амаль ліквідавалі брак, не папулярызуецца ў цэхах сярод рабочых.

Недапушчальным зьяўляецца тое, што такарны цэх, напрыклад, ня мае ні аднаго пэўнага стандартнага калібру і шаблёну для прыёмкі работ. Існуючыя вымяральныя прылады не адпавядаюць свайму прызначэньню.

Брак у механічным цэху фактычна абязьлічан. З-за адсутнасьці кладоўкі рабочыя бяруць бяз усякага кантролю поўфабрыкаты і ламаюць іх. Так, у цэху знойдзена 13 папсаваных палышнікаў валу для бульбакапалкі, 9 штук паламаных дэталяй № 9 і 10 да жмыхадрабілак і 64 папсаваныя зубчаткі. Вінаватыя ў паломцы не выяўляюцца.

Галавая задача заводзкіх арганізацый — мабілізаваць усю заводзкую грамадзкасьць на рашучую барацьбу з бракам. Трэба дабіцца неадкладнага паляпшэньня якасьці прадукцыі на аснове поўнай рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна. Белмэталяаб'яднаньне павінна забясьпечыць завод добрым чыгуном, бо апошнія 5 вагонаў чыгуну, прысланыя заводу, нездавальняючай якасьці.

Брыгада «Зьвязды»:
Пімштэйн, Тэвэлеў, Артабалеўскі і Зарубежны.

Узорная брыгада па зборцы корнярэзак

ВІЦЕБСК. (Наш кар.).

Гаспадарча-разрахунковая брыгада па зборцы корнярэзак заводу «ЧЫРВОНЫ МЭТАЛІСТ» на ўзорных прыкладах сваёй работы вучыць, як трэба змагацца за выкананьне пляну чацьвертага, заключнага году пяцігодкі.

Ліквідаваць адставаньне, дапушчанае ў студзені, сыстэматычна перавыконваць заданьне — штодзённая праграма дзеяньняў брыгады. Паводле пляну брыгада павінна штодзённа зьбіраць 20 корнярэзак. Яна выканала сустрэчны плян у 23, на справе ж зьбірае па 30-32 корнярэзкі. 8-га лютага яна дала рэкордную лічбу—33.

Гэтых перамог брыгада дабілася шляхам сур'ёзнага дэтальнага вывучэньня ўсіх працэсаў зборкі, шляхам прапрацоўкі рацыяналізатарскіх прапаноў аб удасканаленьні пасобных дэталяй і, нарэшце, што самае галоўнае, шляхам рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна. Члены брыгады ўнесьлі каштоўную прапанову аб рэканструкцыі мадэлі да корпусу корнярэзкі. Праведзеная брыгадай падгонка дыскаў корнярэзкі дала магчымасьць канчаткова ліквідаваць брак. Зараз брыгада ўнесла прапанову аб урэзцы мадэлі чарвякоў, што дазволіць ліквідаваць адну апэрацыю—абточку.

Брыгада налічвае 12 чалавек, кожны з іх прымацаваны да пастаяннага працэсу і нясе персанальную адказнасьць за сваю работу. Такім чынам, у брыгадзе ПОЎНАСЬЦЮ ЛІКВІДАВАНА АБЯЗЬЛІЧКА.

Узорныя прыклады паказвае брыгада і ў захаваньні інструмантаў. За адзін толькі сьнежань яна з'эканоміла на гэтым каля 249 руб. ЯКАСЬЦЬ РАБОТЫ—У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ БРЫГАДЫ.

Брак па віне рабочых канчаткова ліквідаваны. Брыгада ня ведае ні прагулаў, ні спазьніваньняў на работу. Калі адзойдзе рабочыя АРЦЕМ'ЕЎ і СЯМЧУК пашлі з работы раней тэрміну, дык брыгада паставіла пытаньне аб гэтым на сходзе. Сыстэматычна праводзяцца вытворчыя нарады, на якіх выпрацоўваюцца канкрэтныя меры па ліквідацыі пасобных непаладак.

На аснове ўзьнацыя прадукцыйнасьці працы заробтак членаў брыгады павысіўся на 18-20 проц.

На чале брыгады зборкі корнярэзак стаіць малады камсамолец рабкор-ударнік тав. Б. ТЭВЭЛЕЎ.

Лепшыя ўзоры работы брыгады павінны быць перанесены ва ўсе цэхі заводу.

Увага—тэхніцы бясьпецы

З асыгнаваных на гэту справу на заводзе імя Варашылава ў 1931 годзе 20.000 рублёў было скарыстана прамфінпляну, так і ў паляпшэньні дабрабыту рабочых (павялічваецца процант выкананьня прамфінпляну, паменшаецца процант траўматызму сярод рабочых).

З асыгнаваных на гэту справу ў 1931 г. 20.000 рублёў было скарыстана толькі 5.568 р.30 к. Гарэцкая інспэкцыя працы перадала справу пракуратуры для прыцягненьня вінаватых на адказнасьці. Але гэтага мала, трэба ўзьняць на вышыню грамадзкую думку асабліва ў сувязі з тым, што ў гэтым годзе вызначаны вялізарныя сродкі (75 тыс. руб.), а яшчэ нічога ня зроблена.

Вывозіць ня менш мільёна кубамэтраў лесу ў дэкаду

УЗМАЦНІЦЬ РАБОТУ ПА АРГАНІЗАВАНЫМ НАБОРЫ ВОЗЧЫКАЎ

Трэцяя пяцідзённка лютага, у параўнаньні з першай дэкадай, дала нізкачаны зрух у лесавывазцы. Калі за першую дэкаду па БССР было вывезена 568.000 кбм. дроў і песу, дык за трэцюю пяцідзённку—448.000 кбм., або 89,6 проц. пяцідзённага заданьня.

Такім чынам, ня гледзячы на некаторы зрух, пяцідзённае заданьне значна недавыканана. Яшчэ горшае становішча мы маем з ажыцьцяўленьнем квартальнага пляну, які да 15 лютага выкананы па вывазцы дроў на 33,5 проц., па лесаматар'ялах—на 29,8 проц. Зводка аб ходзе вывазкі, якую мы сёньня друкуем, сьведчыць аб тым, што значная частка асноўных лесапрамгасаў (Асіпавіцкі, Глускі, Бярэзінскі, усё яшчэ знаходзяцца ў глыбокім тыле лесавывазкі.

Партыйныя, савецкія і лесазагатоўчыя арганізацыі гэтых раёнаў параней шаму недадзіньваюць усёй важнасьці барацьбы за лес, за своячасовае і бесьперабойнае забясьпячэньне драўнінай раду галін прамысловасьці і будаўніцтва.

Чым інакш, як не апартуністычнай бязьдзейнасьцю работнікаў Глускага лесапрамгасу, можна вытлумачыць той факт, што квартальнае заданьне на 15-га лютага па вывазцы лесаматар'ялаў выкананa на 25,3 проц., а па дровах—на 17,8 проц.

Зусім слабая масавая работа ў радзе раёнаў (Бягомльскі, Быхаўскі, Гомельскі, Слуцкі, Чэрвеньскі, Чачэрскі і інш.) закон арганізаванага набору возчыкаў прывяла да таго, што плян лесавывазкі на 10 лютага быў забясьпечан возчыкамі на 50,2 проц. Дырэктыва Наркамгасцэнтру аб замацаваньні спэцыяльна за лесавывазкай 65.000 калгасных фурманак ня выканана поўнасьцю—замацавана толькі 27,5 проц. заданьня.

Заклік калгасу «Ясная раніца» аб сустрэчных плянах па лесавывазцы і арганізацыі пастаянных абозаў, з прычыны слабай яго папулярызацыі сярод калгасных і бядняцка-сераднячых мас у большай частцы раёнаў (за выключэньнем Барысава, Бабруйску і Рэчыцы) не знайшоў яшчэ шырокага водгуку.

Для пасьляховага скончэньня квартальнага пляну лесавывазкі, трэба, каб кожную дэкаду вывозілася ня менш 1 мільёну кбм. дроў і песу. Гэта абавязвае ўсе арганізацыі, асабліва адстаючых раёнаў, прыняць меры для таго, каб павысіць тэмпы лесавывазкі мінімум у 2-3 разы.

Толькі шырокая разгорнутая масавая работа сярод калгасных і бядняцка-сераднячых мас, бязьлітасная барацьба з апартуністычнай стаўкай на самацёк у наборы возчыкаў і з кулацкім собатажам, накіраваным на зрыў лесавывазкі, забясьпечыць посьпех выкананьня пляну.

Зводка леса-агатовак і вывазкі на 15-га лютага 1932 году па асноўных леспрамгасах БССР.

№№	НАЗВА ЛЕСПРАМГАСАЎ.	Загатоўлена ў проц. да квартальнага заданьня		Вывезена ў проц. да квартальнага заданьня	
		Лесаматар.	Дроў.	Лесаматар.	Дроў.
1.	Асіповіцкі	60,9	52,2	21,4	24,9
2.	Бабруйскі	63,2	54,3	21,4	29,0
3.	Барысаўскі	55,6	80,3	31,1	51,8
4.	Бягомльскі	58,6	53,0	27,6	25,9
5.	Бярэзінскі	68,2	42,3	34,9	39,6
6.	Быхаўскі	49,0	53,7	16,7	38,4
7.	Гомельскі	80,9	159,4	30,8	35,3
8.	Горацкі	60,5	45,5	38,2	33,1
9.	Глускі	54,5	77,5	25,3	17,8
10.	Крупскі	51,2	46,9	35,0	32,3
11.	Лельчыцкі	50,8	71,0	34,5	94,8
12.	Лепельскі	41,6	61,7	25,1	36,8
13.	Парыцкі	45,6	52,7	18,3	32,9
14.	Пятрыкоўскі	100,1	64,1	42,4	46,6
15.	Рэчыцкі	72,1	53,0	35,3	36,5
16.	Сеньненскі	26,9	38,6	15,8	14,0
17.	Сіроцінскі	24,6	55,3	12,3	38,9
18.	Слуцкі	42,6	95,8	38,8	35,4
19.	Чачэрскі	44,9	40,5	20,6	22,0
20.	Чэрвеньскі	65,6	107,1	38,8	35,9

Месячнік ня даў яшчэ пералому

ВІЦЕБСК.

Першыя 10 дзён абвешчанага месячніка лесазагатовак і вывазкі належнага пералому не зрабілі. Паводле пляну, за 10 дзён лютага павінна было быць вывезена 19.600 кбм. дроў і лесу, фактычна-ж вывезена 4.480 кбм. Квартальны плян на 10 лютага па вывазцы дроў выкананa усяго на 17 проц., па будаўнічых матар'ялах — на 23 проц.

Рад сельсаветаў ігнаруе лесавывазку, не забясьпечвае лесавучасткі неабходнай колькасьцю фурманак. Так, В.-Лідгамскі сельсавет на лесавывазку дае ўсяго 19 фурманак, Старасельскі — 25. Бабініцкі — 18, Сяноцкі—10 і Ялагінскі — 9 фурманак.

Райлесрабачком стаіць у баку ад лесазагатоўчай кампаніі. Ударніцтва і сацсаборніцтва, як паміж лесарубамі, так і возчыкамі, не разгорнута. Культмасавая работа не праводзіцца.

З 33 брыгадзіраў, якія былі вылучаны з гораду для правядзеньня месячніка штурму на мясцох, у лесавучастках і сельсаветы выехала толькі 22 брыгадзіры. Лесрабкон сваіх работнікаў кагэтуль яшчэ на вучасткі не накіраваў.

А. З. і З-еў.

РАБОЧЫЯ БУКСІРНЫЯ БРЫГАДЫ—НА ЛЕСАЗАГАТОЎКІ

РЭЧЫЦА. (Наш кар.).

Рэчыцкі райком партыі і райвыканком абвясьцілі двухдэкадні штурм па лесазагатоўках і вывазцы. Для правядзеньня двухдэкадніка на мясцох, у лесвучастках і сельсаветы накіравана 200 ч. партыйна-камсамольскага, праф саюзнага і савецкага актыву. Фабрычна заводзкія камітэты фабрыкі імя Томскага і заводу «Інтэрнацыянал» у дапамогу райлесрабачкому арганізавалі 4 буксірныя брыгады з лепшых рабочых-ударнікаў. Саюз чыгуначнікаў так сама ўзяў на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў па бесьперабойнай адгрузцы экспартнага лесаматар'ялу са станцыі Бабічы і Дземяхі.

Раённая газэта «Рэчыцкая Праўда» ўстанавіла 7 кантрольных рабкораўскіх пастоў на лесавучастках леспрамгасу.

Райвыканкомам, сумесна з леспрамгасам, распрацаваны і спушчаны да кожнага сельсавету, калгасу і вёскі кантрольныя заданьні па загатоўках і вывазцы лесу.

Для забясьпячэньня ўдарнай работы па лесавывазцы мабілізован увесь ліш. транспарт прадпрыемстваў гораду, які дапучан да транспарту леспрамгасу. Арганізаваны паходныя кузьні для коўкі коняй і рамонту саней. НОВІК.

Марксыцка-ленінскае выхаваньне новага папаўненьня—На вышэйшую ступень!

Усім ГК і РК КП(б)Б

Для пасьляховага ажыцьцяўленьня пастановы сакратарыяту ЦК КП(б)Б па правядзеньні двухдэкадніка агляду становішча партвыхаваўчай працы з кандыдатамі і новымі членамі КП(б)Б, культпроп ЦК КП(б)Б прапануе правесьці наступныя мерапрыемствы:

1. У раёне пастановай ГК і РК КП(б)Б ствараецца аглядавая камісія ў складзе 5-7 чал.

2. Аглядавая камісія ў выкананьне дырэктыў ЦК і пастановы РК КП(б)Б арганізуе работу: а) па праверцы выкананьня дырэктыў, даных раней ЦК і РК КП(б)Б па рабоце з кандыдатамі;

б) вывучэньне існуючага зараз становішча па марксыцка-ленінскім выхаваньні кандыдатаў і новых членаў КП(б)Б і ўцягненьні іх у практычную работу партарганізацый;

в) распрацоўку і ажыцьцяўленьне мерапрыемстваў на 100 проц. ўцягненьне ў сыстэму партасьветы кандыдатаў і новых членаў партыі і арганізацыі іх практычнай працы.

3. Для правядзеньня работы па аглядзе неабходна ў распараджэньне аглядавай камісіі вылучыць брыгаду таварышоў з партактыву, разьмеркаваць вучасткі работы ў брыгадзе, кіруючы іх работай у працэсе агляду.

4 Цэнтральным і раённым газэтам забясьпечыць сыстэматычную з дня ў дзень падборку па пытаньнях агляду, арганізаваўшы для гэтай работы брыгады рабселькораў.

5. Для выкананьня пастаўленых перад двухдэкаднікам агляду задач арганізаваць работу наступным чынам:

а) абгаварыць задачы дэкадніка на бюро РК КП(б)Б і на сходах парт'ячэек з папярэдняй праверкай выкананьня даных раней дырэктыў па рабоце з кандыдатамі;

б) вывучыць склад кандыдатаў і новых членаў КП(б)Б (прыйму 1931 г.) у партарганізацыях па месцы іх вытворчасьці (дзе працуе, як выконвае працу) падрыхтаванасьць агульнай і палітычнай нагрузкі, якую зараз выконвае.

Адначасова праверыць, дзе і як вучыцца, як спраўляецца з партнагрузкай, якія мерапрыемствы праводзілі ячэйкі па дапамозе як у вучобе, так і ў выкананьні нагрузкі;

в) якія формы партвучобы (кандыд. школы, гурткі па падрыхтоўцы ў партыю і інш.) скарыстоўваюцца для партвыхаваньня кандыдатаў, як забясьпечан вытворчы прынцып арганізацыі школ і гурткоў, забясьпечанасьць іх прапагандыстамі і падрыхтаванасьць апошніх; як партшколы дапамагаюць у выкананьні нагрузкі кандыдатаў і новых членаў КП(б)Б; чаму ня ўсе кандыдаты ахоплены вучобай (высьвятленьне канкрэтных прычын зрыву вучобы кандыдатаў);

г) распрацоўка мерапрыемстваў па паладжаньні работы з кандыдатамі павінна праводзіцца з шырокім удзелам апошніх, для чаго скарыстаць нарады кандыдатаў, сходы іх з абгаварэньнем існуючага становішча па рабоце сярод новых папаўненьняў і абгаварэньня мерапрыемстваў па паладжаньні гэтай работы;

д) для паляпшэньня якасьці працы з кандыдатамі правесьці нарады прапагандыстаў, працуючых з апошнімі, прыцягнуўшы на нарады сакратароў ячэек КП(б)Б. На нарадах абгаварыць мерапрыемствы па паладжаньні работы з кандыдатамі як у галіне марксыцка-ленінскага выхаваньня, так і партнагрузкі. Вылучыць дадаткова з партактыву больш падрыхтаваных таварышоў для работы з кандыдатамі. Дадаткова арганізаваць сетку кандыдацкіх школ і гурткоў. Асобна распрацаваць плянавыя мерканаваньні па марксыцка-ленінскім выхаваньні кандыдатаў і беспартыйнага актыву, які рыхтуецца ў партыю;

е) асобную ўвагу пры правядзеньні агляду зьвярнуць на выяўленьне становішча агульнай пісьменнасьці кандыдатаў і новых членаў КП(б)Б, арганізаваць работу па ліквідацыі ня пісьменнасьці й малапісьменнасьці апошніх

6. Вынікі агляду прапрадаваць на пасяджэньні бюро РК КП(б)Б і з пастановай апошняга даслаць у культпроп ЦК КП(б)Б.

7. Арганізаваць асобна пры райпартгабінетах сыстэматычную кансультацыю для прапагандыстаў і сакратароў ячэек КП(б)Б, як па лініі партасьветы, так і па лініі практычнай працы кандыдатаў, таксама канцэнтруючы вопыт работы ў гэтай галіне.

Нам. заг. культпропам ЦК КП(б)Б
ЗАЛАТУХІН.

Заг. сэктарам прапаганды культпропу ЦК КП(б)Б
РАМАНЧУК.

Барысаўскі і Церахаўскі раёны абавязаны неадкладна ліквідаваць адставаньне ў жывёлазагатоўках

Узмацніць апэрацыйнае кіраўніцтва

БАРЫСАЎ.

Некаторыя сельсаветы не разгарнулі масава-растлумачальнай работы сярод калгасьнікаў і адзяласобнікаў—бедняцкой і сераднячай вясы пытаньняў жывёлазагатовак. У выніку па Чарнявіцкім сельсавеце з пачатку 1932 году не загатоўлена ніводнага цэнтнера мяса. На іншых сельсаветах загатоўлена зусім жэбрная колькасьць жывёлы.

На 10 лютага плян жывёлазагатовак у сярэднім па раёне выкананa: па буйной рагатай жывёле на 10,3 проц., па сьвіньнях—на 2,3 проц., па авечках — на 1,9 проц.

Гэтыя лічбы гаворыць аб яўна незадавальняючым кіраўніцтве жывёлазагатоўкамі з боку некаторых раённых арганізацый. Праўленьне райпагаспаркому пакінула ўсюю вымяла калгасам кантрольныя лічбы, што не магло не адбіцца на ходзе кампаніі.

У пасобных калгасах існуюць рэзервы, месьцэвыя тэмпацыі, якія вызначаюцца ў расходзе жывёлы для мясцовых патрэб за іх выкананьне заданьняў па загатоўках. Калгас «Новае жыцьцё», Баляніцкага сельсавету, пастаўлены на адзнаку сьвіней для мясцовых патрэб, а здолеў таварную прадукцыю дадаткова адгадаваць.

Раённыя арганізацыі на гэтыя факты не рэагуюць.

Дрэнна абвешчана на ходзе жывёлазагатовак невыкананьне тыдняў аб стымуляваньні жывёлазагатовак прыватнаўласнікаў. Райпаказкупсаюз скарыстаў вызначаныя фонды не па прызначэньні.

Барысаўскія раённыя арганізацыі абавязаны неадкладна прыняць радучыя меры, каб забясьпечыць своячасовае і поўнае выкананьне пляну жывёлазагатовак.

Н. Нэйдзін, Л. Гарэцкі.

ЗРЫВАЮЦЬ КАНТРАКТАЦЫЮ

РЭЧЫЦА.

Па Рэчыцкім раёне плян жывёлазагатовак першага кварталу выкананa на 28 проц., з іх па буйной рагатай жывёле — на 39 проц., па сьвіньнях — на 19 проц., аўцах — 37 проц.

Некаторыя сельсаветы, як Балашоўскі, Гаевскі, Пацалескі, Дзюрдзеўскі і Барычоўскі на выказалі ніводнага процанту пляну.

Па розе сельсаветаў — Розанска-Слабодзкім, Нова-Барсуцкім — выяўлены факты разбазарваньня жывёлы, якая падлягала здачы ўзаркаваю. Па гэтых сельсаветах жывёла і сьвіньні пастуцаюць у значнай колькасьці на прыватны рынак у той час, як плян загатовак зрываецца.

Дзюрдзеўскае, Дзюрдзеўскае, Розанска-Слабодзкае і Бабляўскае сельспажыўтаварыствы разбазарваюць прамтавары, якія прызначаны для стымуляваньня жывёлазагатовак. Райсаюз

Дэкада бязьдзейнасьці мясазагатоўцаў

ЦЕРАХОЎКА. (БЕЛТА).

Апошняя дэкада зьявілася фактычна дэкадай бязьдзейнасьці мясазагатоўцаў. За дэкаду прырост у выкананьні пляну жывёлазагатовак складае ўсяго: па аднаасобным сэктары — 1.3 проц., па калгасах — 0,2 проц. У сярэднім квартальны плян на 15 лютага выкананa па калгасах на 3,2 проц., па аднаасобным сэктары—на 13 проц.

Вельмі дрэнна стаіць справа з афармленьнем кантрактацыйных дагавораў на калектыўную гадоўлю і здачу дзержаве сьвіней несацыялізаванымі калгасамі. Заданьне выкананa усяго на 7 проц.

Райвыканкомы і пасобныя сельсаветы раёну недаацэньваюць важнасьці жывёлазагатовак, не прымаюць належных мер, каб забясьпечыць іх поспех. Толькі два сельсаветы правялі жывёлазагатоўкі здавальняючымі тэмпамі. Гэта Прамопаўскі і Перарослаўскі сельсаветы, выканаўшыя квартальны плян у памерах каля 60 проц.

С.

Ул. Александровіч

Запкаваньне глебы—адна з галоўных умоў узьняцьця ўраджайнасьці

У даны момант, калі ў БССР калектывізавана звыш 50 проц. бядняцка-сераднячых гаспадарак. Ва ўмовах дробнатаварнай сацыялістычнай гаспадаркі, апірываючыся вялізарным матэрыяльнасьці для правядзеньня агратэхнічных мерапрыемстваў, мерапрыемстваў па ўзьнятьні ўраджайнасьці, асабліва па хімізацыі глебы. Пры дапамозе хімізацыі мы павінны вырашыць цэнтральную праблему—павышэньне ўраджайнасьці калгасных і саўгасных палёў. У сельскай гаспадарцы праз галоўнае ня толькі ў пашырэньні пасеўных плошчаў, але і ў павышэньні якасьці сельска-гаспадарчай вытворчасьці. Наша чарговая задача ў сельскай гаспадарцы — пераход ад экстэнсыўнай гаспадаркі, дзе яна ёсьць, да інтэнсыўнай.

Разьвіцьцё хімізацыі мае непасрэдны ўплыў на матар'яльны ўзровень працоўных праз павышэньне ўраджайнасьці збожжавых і тэхнічных культур і разьвіцьцё жывёлагадоўлі. Праз хімізацыю гэмляробства мы зможам пашырыць сырцовую базу для лёгкай прамысловасьці.

Ва ўмовах БССР, дзе пануюць падзолавыя і забалочаныя тыпы глебы з кислай рэакцыяй, з дрэннымі фізычнымі і біялёгічнымі ўласьцівасьцямі, адным з галоўных мерапрыемстваў хімізацыі сацыялістычнага земляробства зьяўляецца запкаваньне глебы.

Дагэтуль запкаваньне на практыцы ўжывалася зусім нэпыстарчальна. План запкаваньня ў 1931 г. выкананa на БССР на больш, чым на 17 проц.

Такое становішча з ужыцьцяньнем запкаваньня тлумачыцца тым, што ў многіх саўгасах і калгасах амаль зусім не разгорнута работа па вуладаньні агратэхнікай, яшчэ шырока не палучылі распаўсюджаны навуковыя дасягненьні нашых лясьлечных станцый. У выніку на многіх запкаваньне часта не прыстасоўвалася да ўмоў глебы, па пасобных сельска-гаспадарчых культур і інш., што давала адмоўны ўплыў па ўраджайнасьці глебы і ўраджайнасьць.

Выкалі выпадкі, калі пасобныя саўгасы і калгасы з гэтай прычыны атрымалі ад запкаваньня.

Запкаваньне спрыяе паляпшэньню фізычных уласьцівасьцяй (структуры) і павышэньню мікрабіялёгічных працэсаў у глебах. Ужываючы запкаваньне, мы здолеем зьнізіць кіслотнасьць глебы, якая перашкаджае нармальнаму разьвіцьцю сельска-гаспадарчых расьлін, асабліва канюшыны і некаторых іншых бабовых расьлін.

Навуковыя дасягненьні нашых лясьлечных станцый, досьледы саўгасаў і калгасаў даюць ужо ўгрунтаваны матар'ял па гэтым пытаньні. Возьмем, напрыклад, такія цэнтральныя аграхімічныя лябараторыі (досьледы рабіліся пляцем павярхоўнага ўнясеньня канюшынчча вясной і бараненьня). Нормы запкаваньня ў розных частках БССР ужываліся розныя — у раёнах Мешчыны — 5 тон на гэктар, у Арэшкінчыне—каля 2 тон. Мазырчыне — 1 тона, на Бабруйчыне, Магілёўчыне і Гомельчыне колькасьць укладзенай запкаваньня хіталася ад 0,9 да 2,4 тон.

Хада дзейнасьць запкаваньня пры паверхоўным яе ўкладаньні значна мацнейшая, чым пры ўкладаньні пад ворыва, але атрыманыя вынікі яшчэ паказваюць уплыў запкаваньня на павышэньне ўраджайнасьці.

На суглінках пры сярэднім ураджаі сена-канюшыны (без усяго ўнясеньня) у 43,1 цэнт. з гэктара, запкаваньне павялічыла ўраджайнасьць на 19,3 цэнт., г. зн. на 44,5 проц. больш, чым ураджай з неапрацаванага поля.

На суглінках Магілёўшчыны, Бабруйшчыны і Гомельшчыны пры сярэднім ураджаі сена-канюшыны без запкаваньня ў 24.6 цэнт., запкаваньне павялічыла ўраджайнасьць на 3,9 цэнт., або на 16 проц.

На кіслых суглінках Віцебскай сельска-гаспадарчай досьледнай станцыі адна крэйда ў колькасьці 1.8 тоны на гэктар павялічыла ўраджай аўса на 2,3 цэнт. і ячменю — на 1,6 цэнт.

У лубінавым совгасе досьледнага поля Горацкай с.-г. досьледчай станцыі ўкладаньне 1.8 тоны адкай вапны пад лубін на заліўнае ўгнаеньне, павялічыла на другі год ураджай бульбы на 26.5 цэнт., а на трэці год пасьля запкаваньня ўраджай зерня аўса павялічыўся на 2 цэнт., а ўраджай саломы—на 35 проц.

У 1929 годзе на Віцебскай с.-г. досьледчай станцыі запка ўкладалася на суглінстай глебе як разам з поўным мінэральным угнаеньнем (азот, фосфар, калій, вапна), так і асобна.

Адна вапна без іншых угнаеньняў давала павялічаньне на сяннавым ільне ад 2.9 да 4.2 цэнт. на гэктар.

З гэтых кароткіх паказальнікаў (далёка ня ўсіх) відавочны ўплыў запкаваньня на ўраджай сельска-гаспадарчых расьлін.

У мінулым годзе па гэтага важнага агратэхнічнага мерапрыемства з боку Наркамзему БССР была праяўлена поўная недаацэнка. Па-першае ня была вывернута ўвага на падрыхтоўку праз аграхімічныя курсы патрэбных кадраў. Замест 50 райагранамкаў у 1931 годзе падрыхтавана толькі 23.

Па-другое, кіраўніцтва навучальні райагранамкаў абмежкавалася толькі дасьлікай схэм па закладцы досьледчых вучасткаў. РВК і райвыканкомы не прыстасоўвалі райагранамкаў не па прызначэньні, бадзяцца ад лямбораторый і аграхэмпрылады па многіх раёнах зусім не скарыстоўваліся. Выкананьне працы ў раёнах па аграхаміі ніякіх яшчэ.

Трэба памятаць, што запка, укладзеная ў глебу адзін раз, дае павышэньне ўраджайнасьці на працягу 8-10 гадоў. Адгэтуль зусім зразумела, што гара ўжо варыцца ад гутаркі аб запкаваньні перайсьці да канкрэтнай работы, да самога запкаваньня глебы.

У гэтым годзе па БССР выкананa правесьці запкаваньне на плошчы ў 60.000 гэкт. Гэты плян зусім рэальны. Трэба толькі ўзьняць на гэту справу шырокія масы рабочых саўгасаў і калгасьнікаў.

Але пашырэньня даных сьвечаць, што важнейшаму агратэхнічнаму мерапрыемству пагражае зрыў. Для таго, каб правесьці запкаваньне на плошчы ў 60.000 гэкт., трэба перакалоць да вясны звыш 194.950 тон запкі. Фактычна-ж загатоўлена толькі 645 тон запкі. Амаль усе запкаваныя ямы не працуюць.

Калгасцэнтр, Трактарацэнтр, пасобныя райвыканкомы, райсаўкалгасаюзы не адгаюць ўвагі запкаваньню. З боку НКЗБ яма выстарчальнага апэрадыйнага кіраўніцтва ў гэтай галіне.

Сельска-гаспадарчая літаратура, у прыватнасьці па хімізацыі сельскай гаспадаркі, якая ёсьць у ДВБ, не прасочваецца ў калгасы і саўгасы, а галамі ляжыць на складах. Ёсьць выпадкі, калі зданыя ў друк навуковыя працы па хімізацыі савецкай гаспадаркі таксама ляжаць амаль гадамі. Напрыклад, інструкцыя цэнтральнай аграхімлябараторыі аб запкаваньні глеб, зданая ў друк у кагі 1931 году, яшчэ і зараз не надрукавана, работа аб «Квасьнасьці глебы Мешчыны», зданая цэнтральнай хімлябараторыі ў жніўні 1931 году, яшчэ ня выйшла з друку.

Мерапрыемствы па запкаваньні глебы павінны стаць адной з першачарговых задач агранамій. Агрономы, сельска-гаспадарчыя досьледныя станцыі, навуковыя ўстановы, саўгасы і калгасы павінны ператварыць запкаваньне глебы ў сыстэматычнае мерапрыемства па павышэньні ўраджайнасьці.

У кожным раёне, калгасе і саўгасе да першага веснавога ворыва трэба выпачыць глебы, якія патрабуюць запкі. Кожны раён павінен мець глебавую карту з вызначэньнем тыпаў глеб і іх кіслотнасьці. У кожным саўгасе і калгасе павінна быць карта гас паларкі з вызначэньнем палёў па кіслотнасьці і патрэбе ў запке і мінэральных угнаеньнях.

Кожны аграном, кожны калгасьнік павінен ведаць практычна, як вызначаць глебу, якая адчувае патрэбу ў запке, як практычна ўжываць запку, пітучае ўгнаеньне і іншыя агрэкарэрыемствы, накіраваныя на павышэньне ўраджайнасьці.

З боку НКЗБ, Калгасцэнтру, райвыканкамаў, саўгасаў і калгасаў ставіцца быць адпала максымум увагі на неадкладнае ўзбраеньне гэтымі вопамі рабочых саўгасаў і калгасьнікаў, праз арганізацыю ў кожным саўгасе і калгасе адпаведных гурткоў, лекцый і г. д.

Камсамол і ячэйкі Асоавіяхіму ў саўгасах і калгасах павінны стаць ініцыятарамі хімізацыі сельска-гаспадарчай вытворчасьці на практыцы.

У кожным раёне для абслугоўваньня калгасаў і саўгасаў праз раённыя аграхімічныя курсы трэба да веснавога ворыва падрыхтаваць з рабочых саўгасаў і калгасьнікаў тэхнікаў-брыгадзіраў па хімізацыі, якія б ведалі як практычна ўжываць запкаваньне і штучныя ўгнаеньні.

Райаграхімікаў і агранамаў трэба забясьпечыць належным практычным і тэхнічным кіраўніцтвам з боку цэнтральнай аграхімічнай лябараторыі, якая павінна рашуча паставіць перад сабою задачу — ўцягнуць у гэту работу шырокія масы савецкіх спэцыялістаў, рабочых саўгасаў і калгасьнікаў.

ПЕРАГАВОРЫ ПАМІЖ ЯПОНІЯЙ І КІТАЯМ ПЕРАРВАНЫ

Разгортваецца падрыхтоўка да новых вялікіх баёў

Японскі ультыматум

ТОКІЕ, 17. Агенцтва Сімбун Рэнга ўказвае, што СІГЕМІЦУ ва ўльтыматуме кітайскаму камандаванню патрабуе АДВОДУ КІТАЙСКІХ ВОЙСК НА 20 КЛМ. АД СЭТЛЬМЭНТУ І ФРАНЦУСКАЙ КАНЦЭСІІ. Кітайцы, якія знаходзяцца ў межах 20-кілёмэтравай зоны, ПАДЛЯГАЮЦЬ РАЗЗБРАЕНЬНЮ. Адвод кітайскіх войск павінен пачацца праз 24 гадзіны пасьля перадачы ультыматуму і павінен быць скончан у 48 гадзін пасьля перадачы ультыматуму. Ультыматум будзе перадан сёньня кітайскаму Мэру Шанхаю, а таксама Цай Цін-каю (камандзір 19-ай кантонскай арміі). АГЕНЦТВА СІМБУН РЭНГА НА ПАДСТАВЕ ПАВЕДАМЛЕНЬНЯЎ З ШАНХАЮ, ПРАДБАЧЫЦЬ, ШТО КІТАЙСКІЯ ВОЙСКІ АДХІЛЯЦЬ УЛЬТЫМАТУМ І ШТО Ў СУВЯЗІ З ГЭТЫМ НЯМІНУЧЫ ВАЕННЫЯ ДЗЕЯНЬНІ ШЫРОКАГА МАШТАБУ.

Перагаворы перарваны

ШАНХАЙ, 18. Перагаворы паміж японскім і кітайскім камандаваньнем ПЕРАРВАНЫ з прычыны няпрыняцьця кітайцамі японскіх патрабаваньняў.

Японскія самалёты капя Нанкіну

ШАНХАЙ, 18. Шэсьць японскіх ваенных самалётаў зрабілі палёты над Сучжоу (буйны чыгуначны пункт на ляе Нанкіну). Палёты выклікалі панику сярод насельніцтва.

Прапанова амэрыканскіх консулаў у Шанхаі і Нанкіне

ШАНХАЙ, 18. Амэрыканскія консулы ў Шанхаі і Нанкіне прапанавалі амэрыканскім рэзыдэнтам, місіям і місіянэрам скласьці спіс іх маёмасьці, каб прыняць крокі да яе аховы.

Артыперыйская перастрэлка

ТОКІЕ, 18. Сімбун Рэнга паведамляе з Шанхаю, што там учора адбывалася жорсткая артыперыйская перастрэлка. Насельніцтва старога кітайскага гораду Наньдао (каля французкай канцэсіі) у паніцы. З прычыны чутак аб рашэньні японцаў бамбардзіраваць Наньдао, кітайскае насельніцтва ўцякае з гэтага раёну.

Групы японскіх салдат — у Бэйпіне

МУКДЭН, 17. З Бэйпіну паведамляюць, што групы ў 29-30 японскіх салдат у поўным узбраеньні сталі ныўжыцца на вуліцах без папярэдняга паведамленьня кітайскай паліціі. Баючыся ўскладаньняў, кітайскія ўлады прымаюць меры перасьцярогі.

Падзеі ў Манчжурыі і Шанхаі „ня могуць лічыцца канфліктам"

ТОКІЕ, 17. Учора ў выніку нарады кіраўнікоў міністэрства замежных спраў Іосізава прапанаваў Сато пярэчыць супроць скліканьня пленуму Лігі нацый і прыстасаваньня артыкулу 15 статуту Лігі нацый, што падзеі ў Манчжурыі і Шанхаі зьяўляюцца «вынікам ажыцьцяўленьня права самаабароны і таму ня могуць лічыцца канфліктам». Японія згадзілася з правам шанхайскіх консулаў дакладваць аб падзеях. Аднак, гэта не азначае, што Японія згадзілася з укараваньнем 15 артыкулу.

„Адказнасьць пяжыць на Кітаі"

ТОКІЕ, 18. Ангельскі пасол Ліндлей паведаў міністра замежных спраў Нагаю. Францускі пасол Мартэль паведаў Іосізаву. Паслы знаёміліся са зьместам японскага ультыматуму, які ўручаўся кітайскаму камандаваньню. Паводле слоў Сімбун Рэнга, Ліндлей выказаў жаль з поваду таго, што пасярэдніцтва дзяржаў у Шанхаі не дало патрэбных рэзультатаў. Нагай адказаў, што адказнасьць ляжыць на Кітаі, які адхіліў японскія патрабаваньні.

Падрыхтоўка да пазыцый ных баёў

ШАНХАЙ, 18. Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што ад Суйчжоу і адсюль на усход да Кайфэна, Чжэнчжоу і Лоёпа — капаюцца траншэі даўжынёй у сотні міль. У цяперашні час японцамі згрупавана ў Шанхаі больш сотні ваенных аэраплянаў.

14 японскіх ваенных суднаў пя вострве Ціншань

ШАНХАЙ, 18. Агенцтва Гомінь паведамляе, што 14 японскіх ваенных суднаў зьявіліся ля вострава Ціншань на паўночным усходзе ад Нінбо. На борце авіяносца — 35 самалётаў. Раз бурана кітайская радыё-станцыя.

Манэўры скончыліся — флёт застаецца каля Гавайскіх Астравоў

ПЮ-ЕРК, 15. Ня гледзячы на тое, што манэўры амэрыканскага флёту каля Гавайскіх астравоў скончыліся, амэрыканскія ваенна-морскія сілы, як паведамляюць, застаюцца каля Гавайскіх астравоў да 13 сакавіка. У гэты час манэўры маюць адбывацца каля ўзьбярэжжа Паўднёвай Каліфорніі.

Войскі нанкінскага ўраду так сама будуць прымаць удзел у барацьбе

ШАНХАЙ, 18. У сувязі з паведамленьнем з Таніё, што японскі ультыматум будзе прад'яўлен тольці Цай Цін-каю (камандзіру 19-ай кантонскай арміі) міністар фінансаў нанкінскага ўраду Сун Цзэ-вэнь заявіў, што 19-я армія — частка нацыянальнай арміі, падтрымліваецца ўсім кітайскім народам, фінансуецца і спабяцаецца нанкінскім урадам, поўнасьцю выконваючы яго загады ў справе абароны Шанхаю. Калі японцы атакуюць 19-ю армію, войскі нанкінскага ўраду таксама будуць прымаць удзел у барацьбе.

Заява Ван-Цзін-вэя

ШАНХАЙ, 17. Ван Цзін вэй, які прыняў на сябе абавязкі кіраўніка кітайскай замежнай палітыкі, ня гледзячы на тое, што Ло Вэнь-кан ягоўа не падаў у адстаўку, заявіў, што Кітай ня пойдзе ні на абмежаваньне вайны, ні на разрыў дыпляматычных зносін з Японіяй. Аднак, — заявіў далей Ван Цзін-вэй, — нанкінскі ўрад рыхтуецца да доўгага парыяду ўзброенага супраціўленьня. «Калі Кітай абвесьціць вайну, дык па думцы Ван Цзін-вэя, у рэзультаце атрымаецца другое бажэрскае паўстаньне, ад якога Кітай толькі пацерпіць». Ван Цзін-вэй заявіў, што кітайскі ўрад па-ранейшаму спадзяецца, што прадстаўнікі дзяржаў у Шанхаі і ў іншых месцах будуць дабівацца ўстанаўленьня міру. Ван Цзін-вэй выказаў таксама ўпэўненасьць, што ў рэзультаце цяперашняй палітыкі кітайскага ўраду, дыпляматычная перамога будзе на баку Кітаю, бо «лепшай зброяй у руках Кітая зьяўляецца разрыў знаменічных узземаадносін з Японіяй. Кітай спадзяецца выкарыстаць гэту зброю найшырэйшым чынам».

З благаслаўленьня Лігі-нацый

ЛЕНДАН, 17. На пытаньне ў палаце вобшчын — ці ўвойдзе ангельскі ўрад у зносіны з урадам ПАЗШ, Францыі, Італіі і Германіі ў мэтах сумеснага выступленьня, як напрыклад сумеснага зваротаў з энэргічным пратэстам да японскага ўраду, а затым, у выпадку неабходнасьці адкліканьня паслоў і разрыву гандлёвых зносін, — міністар замежных спраў Саймон адказаў — не. На пытаньне — ці задаволен ён тым, што Ліга нацый ня робіць нічога эфэктыўнага, Саймон сказаў, што ён зусім задаволен. Ліга нацый робіць усё, што яна можа.

На жэнэўскай канфэрэнцыі па „раззбраеньні"

ЖЭНЭВА, 16. Сёньня на канфэрэнцыі выступіў аргентынскі дэлегат Бош, які выказаўся ў карысьць забароны наступальнай зброі вайны і за прыняцьце ў якасьці асновы папярэдняга праекту канвэнцыі. Бош прапанаваў забараніць блёкаду гандлю харчовымі прадуктамі ў часе вайны (трэба адзначыць, што ў сувязі з канфліктам на Далёкім Усходзе ў Аргентыне вельмі ўзрос выраб мясных кансэрваў).

Канада (Пэрсія) заявіў, што ідэалам было-б, эразумела, поўнае раззбраеньне, прапанаванае тав. Літвінавым, або зрабіньне ўзбраеньняў, як гэта прапанаваў Тэўфік Рушдзі-бей. Аднак, паводле думкі прамоўцы, у цяперашні стадыі трэба думаць аб практычна выканальных рэчах. Канада выказаўся за забарону наступальнай зброі вайны, падкрэсьліўшы адначасова, што необходна ўзмацніць узбраеньні слабейшых краін, пазбаўленых моцнай прамысловасьці і ўгнаёваньняў.

Як паказваюць падзеі на Далёкім Усходзе, — заявіў Канада, — цяперашні гарантыі бясьпечнасьці, якія давалася Лігай нацый і не дагаварамі, невыстарчальны. Таму Канада з вялікай зацікаўленасьцю адносіцца да канкрэтных прапаноў Францыі, якія патрабуюць уважлівага абгаварэньня. Канада заявіў, што роўнаслежна са скарачэньнем узбраеньняў, необходна ўзмацніць бясьпечнасьць шляхам стварэньня ўзаемнага падтрыманьня. Закранаўшы становішча Пэрсіі, Канада заявіў, што, з прычыны яе геаграфічнага становішча, Пэрсія адчувае патрэбу ва ўзброенай сіле, выстарчальнай для абароны яе межаў і ўнутранага парадку.

Швэйцарскі міністар замежных спраў Мота выказаў жаль з поваду таго, што Ліга нацый да гэтага часу не аказалася ў стане спыніць узброены канфлікт на Далёкім Усходзе, і ўказаў на небясьпечнае становішча, якое стварылася ў выніку, калі-б пакты Лігі і Кэлёга аказаліся бясьсільнымі. Мота гаварыў аб становчым значэньні ўсіх зробленых да гэтага часу прапаноў, абыходзячы, аднак, моўчкі выступленьне Літвінава і толькі ў агульнай форме выказаўшыся супроць поўнага раззбраеньня.

Марынковіч (Югаславія) заявіў, што неабходна правесьці строгай розьніцу паміж наступальнай і наступальнай зброяй вайны і выказаўся ў прынцыпе за забарону хімічнай вайны і яе падрыхтоўкі.

Аднак, — заявіў Марынковіч, — без міжнародных санкцый такая забарона была-б ілюзіяй, бо законы вайны захоўваюцца толькі ў мірны час. Без устанаўленьня санкцый Югаславія пойдзе на забарону хімічнай вайны толькі з рэштай рашучых агаворак.

Марынковіч падтрымліваў польскія прапановы аб «маральным раззбраеньні» і французкія прапановы аб «інтэрнацыянальнай арміі» і выказаўся супроць поўнага раззбраеньня.

***

„Існуючы ўзровень узбраеньняў не адпавядае бясьпечнасьці Румыніі"

ЖЭНЭВА, 17. У разьвіцьцё французкіх тэзісаў выступіў з прамовай фінляндзкі дэлегат Коскінен. Коскінен нагадвае аб прыняцьці Фінляндыяй жэнэўскага пратаколу, а таксама аб слаўтай прапанове Фінляндыі па жаданьні фінансавай дапамогі краіне, на якую нападаюць. Коскінен асабліва падкрэсьлівае гатоўнасьць Фінляндыі ахвяраваць з'устанаўленьнем міжнародных санкцый, якія вынікаюць з пакту Лігі нацый.

Румынскі міністар замежных спраў ГІКА поўнасьцю падтрымлівае французкія тэзісы і польскую прапанову аб «маральным раззбраеньні». Гіка спыняецца на асаблівым геаграфічным становішчы Румыніі і сьцьвярджае, што існуючы ўзровень узбраеньняў не адпавядае патрабаваньням бясьпечнасьці.

У Гішпаніі ўсеагульная забастоўка пашыраецца

МАДРЫД, 18. Учора ў Сарагосе рабочыя ня спынялі забастоўкі. Апрача арыштаваных 100 чалавек паліцыя правяла новыя арышты. У Сэвільі забастоўка таксама працягвалася. Трамваі абслугоўваліся салдатамі. Паліцыя зрабіла рад новых арыштаў. У Хуэльва ўчэрары адбылася сутычка паміж бастуючымі рабочымі і жандармэрыяй. Завязалася перастрэлка, у рэзультаце якое налічваюцца тры забітыя.

У Лёгран'е праведзены арышты. У Віго, Фэрале і іншых пунктах забастоўка ідзе далей. Разам з тым, у некаторых пунктах, як у Картагене, забастоўка ўчора толькі пачалася. У Аліканце забастоўка пачала пачацца сёньня. У Барсэлёне ўчора выбухам дынаміту ўрываваны два электрычныя кабелі высокай напругаванасьці.

Арыштаваныя рабочыя пераданы ваеннаму суду

МАДРЫД, 17. Прамадзянскі губернатар Барсэлёны заявіў, што арыштаваныя ў часе апошніх падзей у Таразе (Барсэлёнская правінцыя) рабочыя будуць перададзены ваеннаму суду.

У Фігальсе выбран савет рабочых дэпутатаў

ПАРЫЖ, 16. Барсэлёнскі карэспандэнт «Юманітэ» перадае падрабязнасьці непадпіх падзей у Фігальсе, які зьяўляўся ў студзені ацыцым з цэнтраў руху ў Барсэлёнскай правінцыі. На масавым сходзе забастоўчыкаў пры вінтарным уздыме быў выбран савет рабочых дэпутатаў. Потым забастоўчыкі навіраваліся ў цэнтральную частку гораду, захапілі зброю і вывезлі чырвоны сьцяг на бульвару муніцыпалітэту.

Жандармерыя была вымушана схавацца ў будынку электрастанцыі. У Мадрыце забастоўшчыя рабочыя захапілі казарму і тэкстыльныя фабрыкі.

Выступленьне дэлегата Новай Зэляндыі

ЖЭНЭВА, 17. Учора на канфэрэнцыі па «раззбраеньні» выступіў дэлегат Новай Зэляндыі Вільфорд, які далучыўся ў асноўным да прапаноў Саймона, Грандзі і Гібсона. Вільфорд выказаўся супроць французкай прапановы, указваючы, што канфэрэнцыя сабралася для таго, каб зьмяншыць ваенныя расходы і скарачэньне, узбраеньне, а не для таго, каб стварыць яшчэ адну вялізарную армію Лігі нацый. Далей Вільфорд заказаў, што бясьпечнасьць стварацца толькі раззбраеньнем. Вільфорд указаў на неабходнасьць забароны ўкараваньня і спрабу наступальнай зброі. Фактычна Вільфорд, не называючы прозьвішча, падтрымаў рад прапаноў тав. Літвінава.

Забастоўка гарнякоў у Польшчы

ВАРШАВА, 18. Сёньня, як і чакалася, выбухнула забастоўка гарнякоў Дамброўскага і Кракаўскага басэйнаў. Паводле газэтных вестак бастуе КАЛЯ 29.000 ЧАЛ. Толькі на некалькіх нязначных капальнях ня спынілі працы каля 750 чал. рабочых. Ля капальняў узмоцненыя паліцэйскія патрулі. ЧАКАЮЦЬ, ШТО ЗАБАСТОЎКА ПАШЫРЫЦЦА І НА ВЕРХНЮЮ СІЛЕЗІЮ. Рабочыя мэталюргічнай прамысловасьці рыхтуюцца да падтрыманьня забастаўчай барацьбы гарнякоў.

Прасьледваньне рабоча-сялянскай прэсы

ВАРШАВА. Польская паліцыя ўзмацніла прасьледваньне рабоча-сялянскай прэсы ў Польшчы. Сьледам за часопісьсю «Ведзе для вшыстких» канфіскавана таксама сялянская часопісь «Глос хлопскі». Сёньняшнія газэты паведамляюць аб налёце паліцыі на львоўскую газэту «Вядомасьці». Арыштаваны выдавец газэты і некаторыя супрацоўнікі.

Прамысловыя цэнтры Польшчы заміраюць

ВАРШАВА, 15. Зноў спыніў, або скараціў працу рад капалень і мэталюргічных заводаў Верхняй Сілезіі. Пасьля зацьвярджанага ўрадам зьніжэньня зарматы на 8 проц. капіталісты распачынаюць новае наступленьне на жыцьцёвы ўзровень гарнякоў.

У апошні час спыніла цалкам працу капальня «Клеофас», 2.200 рабочых апынуліся на вуліцы. Мэталюргічныя заводы «Бісмарк» зволнілі 1.340 рабочых, «Фальва» — 1.011, «Гута Крулевска» — 1.549, «Гута Покою» — 2.300. Спыняе працу капальня «Шарлёта» (2.000 рабочых), «Эмма» (2.800 рабочых), «Блюхер» — (1.700) і «Матыльда» ((1.500).

У Дамброўскім басэйне рабочыя не згадзіліся на зьніжэньне зарматы на 8 проц. У адказ на наступленьне капіталістаў рабочыя рыхтуюцца да забастоўкі. Ужо бастуюць рабочыя капальні «Моджыёва» і «Ежы». Адбыўся мітынг у капальні «Чалядзь». У мітынгу прымала ўдзел 2.500 рабочых, якія пастанавілі зараз-жа далучыцца да забастоўкі.

У самых буйных цэнтрах польскай прамысловасьці — Верхняй Сілезіі і Дамброўскім басэйне — насыпліваюць буйныя клясавыя баі.

Шырока разгарнуць генэральную праверку работы па ліквідацыі няпісьменнасьці

Учора, 19 лютага, пад старшынствам А. Г. Чарвякова адбылося першае пасяджэньне штабу пры ЦВК БССР для арганізацыйнага кіраўніцтва генэральнай праверкай работы па ліквідацыі няпісьменнасьці.

Штаб заслухаў даклад нам. наркома асьветы тав. Брыгневіча пра становішча ліквідацыі няпісьменнасьці і практычных мерапрыемствах у сувязі з правядзеньнем дэкадніка генэральнай праверкі.

У абгаварэньні дакладу і мерапрыемстваў прынялі ўдзел загачык Культпропу ЦК КП(б)Б тав. Чарнушэвіч, т. т. Платун, Стрэле (Белкалгасцэнтр), Міхайлаў («Калгасьнік Беларусі») і інш.

Тав. Чарнушэвіч у сваім выступленьні зазначае, што фактычнае становішча з ліквідацыяй няпісьменнасьці значна горшае ў параўнаньні з тым, як малюць яго нам афіцыяльныя матар'ялы НКА. На 10 лютага, напрыклад, мы маем 80 проц. няпісьменных, ахопленых навучаньнем. Але ў радзе месц ёсьць такія ганебныя факты, калі ліквідпункт зусім разваліўся, або наведваюць яго толькі 2-3 чалавекі з паўсотні запісаных і ніхто не клапоціцца, каб гэту справу наладзіць.

Разам з тым, тав. Чарнушэвіч указвае, што сярод настаўнікаў і шырокай арміі культармейцаў ёсьць сапраўдныя энтузіясты вялікай барацьбы за сацыяльную пісьменнасьць, ёсьць сапраўдныя ўдарнікі-героі. Іх трэба паказаць усёй пралетарскай грамадзкасьці, аб іх павінна ведаць краіна.

Тав. Платун падкрэсьлівае зусім недапушчальныя адносіны камсамольскіх арганізацый да работы па ліквідацыі няпісьменнасьці, ня гэта важнейшая работа ігнаруецца. Між іншым, нават прадстаўнікі ад камсамолу — члены цэнтральнага штабу на правяраемый дэкадніка Рубічык і Перліна — не зьявіліся на пасяджэньне.

Штабам выпрацаваны цэлы рад практычных мерапрыемстваў па разгортваньні дэкадніка генэральнай праверкі.

На чарговым пасяджэньні, якое назначана на 22 лютага, будуць заслуханы даклады больш алсталых раёнаў — Жлобіна, Магілёва, Воршы, Рэчыцы і раёнаў-перадавікоў — Гомаль, Лагойск.

Таксама будуць заслуханы кароткія інфармацыі аб работе Калгасцэнтру, прафсаюзных саюзаў: хатніх работніц, МТС і с.-г. рабочых, хімікаў, будаўнікоў, а таксама рэдакцыі цэнтральных газэт.

Даны ўказаньні пэфэкім таварыствам — неадкладна арганізаваць брыгады для пасылкі ў раёны па праверцы і дапамозе ў работе па ліквідацыі няпісьменнасьці.

Дэкадник зьяўляецца толькі пачаткам тэй шырокай работы, якая павінна сыстэматычна і пасьлядоўна праводзіцца ўсімі навымі арганізацыямі, каб дыярэктыва партыі — аб завяршэньні барацьбы за пісьменнасьць БССР да 1 мая 1932 году — была цалкам і своечасова выканана.

П.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

На рашаючых вучастках

ВУГАЛЬ. 17 лютага па Саюзе здабыта 181.435 тон вугалю, у тым ліку па Донбасе 136.159 тон.

МЭТАЛЬ. 15 лютага па ўсіх мэталюргічных заводах Саюзу выплаўлена 14.658 тон чыгуну і 12.711 тон сталі. Малая мэталюргія дала 1.080 тон чыгуну.

17 лютага зашчта домна № 2 на заводзе імя Фрунзе ў Канстанцінаўцы.

Новыя крыніцы сырцу для сацыялістычнай прамысловасьці

Сёлета будзе ў шырокім маштабе распачата дасьледваньне балотнай жалезнай руды на рэках Барокіне і Прытыці. Паводле папоўных дасьледаў, балотная жалезная руда залягае на плошчы ў 300 кв. клм. Набудова невялікіх мэталюргічных заводаў на дасьледваных балотах забясьпечыць мэталёвую прамысловасьць БССР жалезам і чыгунам. (Белта).

Выпуск Сельгаснашын

13 лютага заводам Гомсельмаш выпушчана 25 сіласарэзак — 80,6 проц. пляну, 21 сячкарня — 123,5 проц., 20 бульбасартовак — 117,6 проц. і 5 капюшнасартовак — 143 проц. пляну.

14 лютага завод выпусьціў 32 сіласарэзкі — 103 проц. пляну, 21 сячкарню — 123,5 проц., 20 бульбасартовак — 117,6 проц. і 6 капюшнасартовак — 171 проц. пляну. Нявыпуск бульбамыек тлумачыцца адсутнасьцю сырцу.

Выраб цукру з клёну

Наркамонаб Саюзу прыняў неабходнымі давадна распрацаваць пытаньне аб вырабе цукру з клёну. Першыя вопыты будуць праведзены ў БССР.

Усебеларуская партнарада па кадрах

Усебеларуская партыйная нарада па кадрах забудзецца 25 лютага гэтага году пры ЦК КП(б)Б з наступным парадкам дня:

1. Вынікі і чарговыя задачы ў галіне вырашэньня праблемы кадраў і кантрольныя лічбы на кадрах 1932 г. (дакл. т. т. Кухаркін і Шапіра — Дзяржынны).

2. Аб становішчы і мерапрыемствах па падрыхтоўцы кадраў калгасных брыгадзіраў, кіраўнікоў фэрм і трактарыстаў у сувязі з задачамі арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў (дакл. т. т. Міцкоў — Калгасцэнтр, Карпакевіч — Трактарцэнтр, т. Сарока — Слуцкі райкалгасаюз, сьцягадоўчая фэрма пры калгасе імя Калініна, Дзержаўскага раёну — дакл. т. Чубрыкова, калочная калгасная фэрма імя Энгельса, Уваравіцкага раёну, ільнаводны калгас Лёльнянскага раёну, дырэктар Вепрыцкай МТС — т. Сундук).

3. Аб становішчы і падрыхтоўцы кадраў для тарфяной і будаўчай прамысловасьці — дакл. Маслюкаў (Белтары); т. Місьнік (Будматар'ялы); т. Лозавой (Агітторф); торфазавод «Шлях сацыялізму» — Добруш, дырэктары калгаснай: Віцебск. Мінск — т. Верыжкоўскі.

4. Аб барацьбе з цяжучасьцю кіруючых кадраў і стварэньні рэзэрваў (дакл. т. Атраноўскі).

5. Аб становішчы падрыхтоўкі кадраў спажывецкай кааперацыі і забясьпячэньня (дакл. т. Шапіра — БКС, т. Волян — НКСнаб, райспажыўсаюз — Пухавічы).

На нараду выклікаюцца загачыкі аддзелаў кадраў гаркомаў і райкомаў — 8 чал., загачыкі арганізацыйна-інструктарскіх аддзелаў райкомаў — 15 чал., дырэктары і сакратары партячэек буйных прадпрыемстваў і новабудоўляў — 13 чал., дырэктары МТС — 3 чал., старшыні райкалгасаюзаў — 6 чал., старшыні калгасаў — 2 чал., кіраўнікі жывёлагадоўчых фэрм — 1, сьцягадоўчай — 1, дырэктары торфазаводаў — 4 чал., дырэктары пагоснь, старшыні райспажсаюзаў — 8 чал., старшыні ЗРК — 4 чал., дырэктары інстытутаў — 1, сакратары пэдвузінстытутаў — 6 чал., дырэктары тэхнікумаў — 8 чал., дырэктары сэмінарыяў — 5 чал.

Акрача таго, загачыкі аддзелаў кадраў цэнтральных устаноў (г. Менску, дырэктары і сакратары партячэек інстытутаў і тэхнікумаў — Менск, дырэктары і сакратары партячэек буйных прадпрыемстваў Менску.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

На падставе пастановы сакратарыяту УсеЦСПС ад 26 студзеня 1932 году.

Усебеларускі зьезд прафсаюзаў

ПЕРАНОСІЦЦА з 20 лютага на 15 САКАВІКА 1932 г.

Парадак дня зьезду:

1) Даклад УсеЦСПС.
2) Справаздача ЦСПСБ і даклад рэвізійнай камісіі.
3) Аб другой пяцігодцы.
4) Аб рабоце прамысловасьці за 1931 год і задачы прамысловасьці БССР на 1932 год.
5) Работае забесьпячэньне, становішча і разьвіцьцё прыгарадных гаспадарак.
6) Даклады НКПрацы і судовага рэспубліканскага камітэту кас сацстраху.
7) Выбары: а) пленуму ЦСПСБ, б) рэвізійнай камісіі ЦСПСБ, в) рэспубліканскага камітэту кас сацстраху, г) дэлегатаў на IX Усесаюзны зьезд прафсаюзаў.

Дэлегатаў на зьезд выбіраюць: а) прадпрыемствы, якія налічваюць ня менш 600 членаў саюзу — на кожных 600 чал. — 1 дэлегата, б) прадпрыемствы, якія налічваюць менш 600 чал. членаў саюзу і ўстановы незалежна ад колькасьці членаў саюзу выбіраюць на Усебеларускіх канфэрэнцыях і зьездах саюзаў — 1 дэлегата на 1000 членаў саюзу, в) 20 кандыдатаў з дарадчым голасам устаноўлена для лепшых ударнікаў, якія маюць асаблівыя заслугі ў барацьбе за выкананьне прамфінпляну і ўнесьлі ў час падрыхтоўчай работы да зьезду прапановы па забесьпячэньні выкананьня вытворчай праграмы і перабудовы прафсаюзнай работы.

АРГБЮРО ЗЬЕЗДУ.

22 лютага, у 7 гадз. веч., у памяшканьні б. кіно „Культура"

АДБУДЗЕЦЦА

ЎРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ МЕНГАРСАВЕТУ

з удзелам партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных, грамадзкіх арганізацый і вайсковых часьцей Менскага гарнізону, прысьвечанае XIV гадавіне Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі.

Члены і кандыдаты Менгарсавету, члены ЦК і ЦКК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ, СНК, ЦВК ЦСПСБ, члены Гаркому і ГарКК КП(б)Б, Гаркому ЛКСМБ і ГСПС, чырвоныя партызаны і чырвонагвардзейцы праходзяць на сваіх мандатах.

Запрашальныя білеты прадпрыемствы і установы атрымліваюць у Менгарпрафсавеце, а вайсковыя часьці — у Менгарсавеце.

Менгарсавет.

Часопісь ВСНГБ і ЦСПСБ

„ШЛЯХ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ",

згодна пастановы ЦК КП(б)Б, пераіменавана на

„ТЭХНІКА Ў МАСЫ"

Першы нумар ілюстраванай навукова-тэхнічнай часопісі „Тэхніка ў масы" выходзіць гэтымі днямі.

Часопісь „Тэхніка ў масы" разьлічана на шырокія колы каманднага складу прамысловасьці, партыйна-камсамольскага прафсаюзнага актыву, кваліфікаваных рабочых, вынаходцаў, радыяналізатараў, ударнікаў.

Часопісь „Тэхніка ў масы" ставіць перад сабой задачу ўнядраньня тэхнікі і сацыялістычнай арганізацыі працы на строга навуковай падставе ў прамысловасьці БССР.

Часопісь „Тэхніка ў масы" мае аддзелы:

1. Агульны; 2. Арганізацыя вытворчасьці; 3. Навука і тэхніка; 4. Абмен вопытам; 5. Кадры; 6. На мясцох; 7. Хроніка; 8. Сярод кніжак; 9. Адказы і кансультацыя.

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На год 3 р. 60 к.; на 6 мес. 1 р. 80 к.; на 3 мес. 90 кап.; кошт паасобнага нумару 30 кап.

Падпіска прымаецца толькі праз пошту і паштовыя агенцтвы.

Адрас рэдакцыі: г. Менск, Пляц Волі, № 2111, ВСНГБ, 2-гі паверх, пакой № 6, тэл. 14-33.

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". Каса — ад 1 г. дня. — Новы тэхнічны фільм ШТУРМ

„Інтэрнацыянал". — Мастацкі бытавы фільм ХТО ВІНАВАТЫ

„ПРАЛЕТАРЫ" — 3 навіны ў адзін сэанс: 1) ЛУЧ Ў РАЮ ў 3 част. 2) ЧАРЛІ Ў ТЭАТРЫ ў 2 част. 3) ЯСО ў 2-х частках.

„СПАРТАК". Пач.: 7, 9 і 11. — 1) ХАНАСІН ў 3 частках. 2) Боэтэр Кітон у нарыце ТРЫ ЭПОХІ каміэдыя ў 6 частках.

Уладзімірскі навучальны камбінат па барацьбе са шкодніками і хваробамі ў сельскай і лясной гаспадарцы „Учкомбон"

абвяшчае ПРЫЁМ заяў

аб залічэньні ўдасьпіранту і на весьнавы набор студэнтаў у інстытут, тэхнікум і рабфак.

У аспірантуру на спэцыяльнасьцях, паказаных у інстытуце. Да заявы неабходна прыкласьці дакумэнты: аб адукацыі, узросьце, сац. становішчы, здароўі, водзывы прафсурсы і арганізацыі (калі ёсьць). Усе аспіранты забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам. Заявы і дакументы адрасоваць у навучальную частку „Учкомбона" (гор. Уладзімір, вул. Фрунзе, д. № 4).

У інстытут на 1-я курсы аддзяленьняў: гародных культур, якое рыхтуе агранома-ня барацьбе са шкодніками і хваробамі гародных культур; плодаваг-ягадных культур, якое рыхтуе агранома-ня барацьбе са шкодніками і хваробамі плодаво-ягадных культур; плянава-эканамічнае, якое рыхтуе агранома-эканаміста-плянавіка-ня барацьбе са шкодніками і хваробамі сельскай і лясной гаспадарцы і эканаміста-плянавіка сельска-гаспадарчай авіацыі; сельскай-гаспадарчай авіацыі, якое рыхтуе інжынераў для ўмываньні авіацыі, ў сельскай гаспадарцы.

У тэхнікум на першы курс аддзяленьня гародных культур, якое рыхтуе тэхнікаў па барацьбе са шкодніками і хваробамі гародных культур.

У рабфак на 1-шы і 2-гі курсы дзённых і вечэрніх аддзяленьняў.

Заявы ў інстытут, тэхнікум і рабфак прымаюцца ад асоб, якія падлягаюць прыёму ў навучальныя ўстановы, згодна палажэньня Наркамасьветы. Да заявы павінны быць прыкладзены наступныя дакумэнты: анкета, засьведчаная партыйным, прафэсіянальным, камсамольскім або савецкім арганізацыямі, аб узросьце, аб сац. паходжаньні, аб сац. становішчы і вытворчым стажы, аб адукацыі, стане здароўя, кароткая аўтабіяграфія, камандыроўка і рэкамэндацыя ад арганізацыі, у якой лічыцца замацлены (камандыроўку можа даць любая арганізацыя без разьбярэтні), дзьве фота-карткі і канверт з паштовым маркам замацаваны з наклеенымі 30 кап. маркамі. Заявы без вышэйпазначаных дакумэнтаў, або з дакумэнтамі ў копіях, разглядацца не будуць. Стыпэндыяй студэнты забясьпечваюцца на агульных падставах, а інтэрнатамі толькі іншагародніх. Апошні тэрмін падачы заяў 20 сакавіка. Пачатак заняткаў 5 красавіка 1932 г. Аб выніках прыёму і аб дні прыезду будзе паведамлена поштай. Заявы падаваць па адрасе: „г. Уладзімір, ул. Фрунзе, д. № 4. „Учкомбон", прыемная комиссия".

Кіраўніцтва ашчаднасамі і дзяржкрэдыту БССР

ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА ТРЫМАЛЬНІКАЎ

10% выйгрышнай пазыкі 1927 г.,

што 1-га лютага 1932 г. адбыўся другі тыраж пагашэньня 100 проц. выйгрышнай пазыкі 1927 г.

У гэтым тыражы пагашаны 4 серыі гэтай пазыкі:

2-ая, 9-я, 12-я і 13-я.

Аплата пазыкатрымальнікам аблігацый 10 проц. выйгрышнай пазыкі, якія выйшлі ў тыраж пагашэньня, пачынаецца з 1-га сакавіка 1932 г. Для тых трымальнікаў 10 проц. пазыкі, якія будуць жадаць закавать (яе выберажыць) у пазыках на далейшы час, ашчадныя касы пачнуць з 1-га сакавіка 1932 г. утварэньне на льготных умовах (па цане пакупкі) абмен аблігацыяй 100 проц. пазыкі, якія выйшлі ў пагашэньне, на аблігацыі 10-ці-гадовай — 5 проц. выйгрышнай пазыкі 1930 г., а таксама на аблігацыі беспроцантнай пазыкі 1929 г.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ на ЗАВОЧНЫ СЭКТАР Магілёўскага педагагічнага інстытуту (спэцыяльна-гістарычнае і літаратурна-лінгвістычнае аддзяленьні) працягнут да 15 сакавіка.

Першыя заданьні будуць разасланы 1-га красавіка. Тым таварышам, якія ўжо падалі заявы, паведамленьні аб залічэньні пасылаюцца па пошце.

Завочны сэктар.

Друкарні газ. „Зьвязда"

ПАТРЭБЕН вопытны бухгальтар.

Зварачацца Менск, Савецкая, 63, 2-гі паверх, у кантору

БЕЛАРУСКІ дзяржаўны тарфяны тэхнікум

у складзе аддзяленьняў эксплёатацыі балот, механічнага і тэхналёгічнага абвяшчае набор на 1-мясячныя вячэрнія падрыхтоўчыя курсы (без адрыву ад вытворчасьці) да асенняга набору 1932 г. На курсы прымаюцца рабочыя, калгаснікі і іх дзеці з асьветай ня ніжэй 5 груп сямігодкі, або з асьветай у роўным абъёме і па ўзросьце да 19 год. Да заявы павінны быць прыкладзены анкета, заверэная па месцы працы і дакумэнты ў арыгіналах, згодна дакладніка НКАсьветы БССР. Пачатак заняткаў 1-га сакавіка 1932 г. Слухачы курсаў стыпэндыяй і інтэрнатам не забясьпечваюцца. Заявы прымаюцца ў канцылярыі тарфянога тэхнікуму штодзённа ад 10 да 2 гадз. дня. Менск, Зямляробскі заз. № 4.

Дырэкцыя.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ на 6-цімесячныя КУРСЫ ПЛЯНАВІКОЎ і старшых вучотна-апэрацыйных працаўнікоў сыстэмы ДЗЯРЖБАНКУ ПРАЦЯГНУТ да 25-га лютага

Аб умовах прыёму на курсы магчыма даведацца ва ўсіх аддзяленьнях Дзяржбанку ў гарадох і раёнах праз якія патрэбна дасылаць усе дакумэнты.

Павчошная арцель імя Крупскай АДКРЫВАЕ

па вул. Калініўскай (б. Екацярынінская